ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 54 (1276) | Субота, 5 ліпеня 1958 года | Цана 40 кап.

Кіно—у кожную вёску

У Крычаўскім раёне добра вядома імя кінамеханіка Анатоля Лук'янчыкава. Яго паважаюць калгаснікі, ахвотна запрашаюць часцей прыязджаць да іх з новымі цікавымі фільмамі. А цяпер ён працуе на стацыянары. Чым заваяваў механік любоў і павагу да сябе? Перш за ўсё, працавітасцю, сумленным стаўленнем да выканання сваіх абавязкаў. Не бывае такога ў Лук'янчыкава, каб ён са спазненнем пачаў сеанс, неахайна дэманстраваў фільмы, каб прастойвала ў яго апаратура ці ён не выканаў заявак сваіх гледачоў. Анатоль Лук'янчыкаў адзін з лепшых механікаў раёна. Ён сістаматычна выконвае і перавыконвае даведзеныя яму планы.

На вёсцы працуюць нямала ўлюбёных у сваю справу энтузіястаў-кінамеханікаў, якія лічаць за гонар тое, што ім даручана несці ў масы святло сацыялістычнай культуры. Колькі добрых удзячных слоў сказана пра кінамеханікаў тт. Галамысава, Картузава і Шульмана (Гомельскі раён), Марука (Капыльскі раён), Ізафатава (Віцебскі раён), Вараб'ёва (Хоцімскі раён), Барбусава (Гарадоцкі раён) і многіх іншых.

За апошні час палепшыліся ўмовы працы сельскіх кінафікатараў. Яны працуюць на новай дасканалай апаратуры. Нельга забываць і пра тую акалічнасць, што з ростам матэрыяльнага дабрабыту калгаснай вёскі больш надаецца цяпер увагі культурнаму будаўніцтву. Клубы будуюць цяпер многія калгасы. У рэспубліцы ёсць раёны, у якіх кожны калгас мае свой клуб. Па пачыну кіраўскіх калгаснікаў распачата будаўніцтва клубаў у брыгадах. Да саракагоддзя Беларускай ССР мяркуецца пабудаваць яшчэ тысячу клубаў. Усё гэта, вядома, паспрыяе таму, што нашы кінамеханікі будуць яшчэ лепш абслугоўваць сельскага гледача.

Да саракагоддзя БССР трэба выканаць узятыя абавязацельствы: не менш трох-чатырох разоў у месяц дэманстраваць фільмы ў кожным населеным пункце. І вось як раз тут органы кінафікацыі маюць найбольш недахопаў.

За агульнымі сярэднімі лічбамі выканання плана ёсць нямала населеных пунктаў, куды перасоўка не прыязджае гадамі. І вось дзесяткі тысяч сельскіх гледачоў, якія любяць кіно і ахвотна наведвалі б яго, па віне некаторых кінамеханікаў пазбаўлены магчымасці знаёміцца з дасягненнямі савецкага кінамастацтва. Вядома, падобныя факты нецярпімы.

Між тым, у рэспубліцы ёсць раёны, дзе пра абслугоўванне сельскага насельніцтва клапоцяцца дрэнна. У Высокаўскім раёне Брэсцкай вобласці у 44 населеныя пункты зусім не прыязджае кінаперасоўка, і сярод іх вёскі Кавалікі, Баршчова, Дзюбыева, Бардзееўка, Радзевічы, Ясінаўка, якія налічваюць больш за сто двароў кожная. Не дэманструюцца фільмы нават у такіх вёсках, як Зламышля і Юсічы, дзе ёсць калгасныя клубы. Або возьмем Мінскі раён, і тут паўтараецца тая ж сумная карціна. Больш 140 населеных пунктаў, якія налічваюць звыш 25 двароў, не уключаны аддзелам культуры ў план абслугоўвання. У іх гадамі не ставяцца фільмы. Таксама дрэнна наладжаны паказ фільмаў у сельскай мясцовасці некаторых раёнаў Гродзенскай вобласці.

Само жыццё высунула такую дзейсную форму абслугоўвання жыхароў калгаснай вёскі, як стацыянары. Стацыянар — гэта невялічкі пастаянна дзеючы сельскі кінатэатр. Амаль поўнасцю закончана стацыяніраванне сельскай кінасеткі ў Гомельскім раёне. Цяпер там працуюць 17 стацыянараў і сем кінаперасовак, якія абслугоўваюць выключна невялікія вёскі. Жыццё паказала поўную рэнтабельнасць сельскіх кінатэатраў і, што вельмі важна, значна палепшылася абслугоўванне калгаснага гледача.

У многіх раёнах рэспублікі таксама надаецца значная ўвага гэтай справе. У Нясвіжскім раёне, напрыклад, працуюць трынаццаць стацыянарных кінаўстановак. Стараюцца сельскія кінатэатры ў Капыльскім, Стаўбцоўскім, Гарадоцкім, Чачэрскім і іншых раёнах Беларусі. Стацыянары павінны працаваць у першую чаргу ў буйных населеных пунктах, дзе ёсць шырокая сетка калгасных і сельскіх клубаў, абсталяваных кінаапаратнымі. Ужо цяпер трэба паклапаціцца, каб у кожным сельскім кінатэатры было ўтульна, чыста, было месца сесці кожнаму гледачу. Стацыянары трэба планаваць так, каб у раёне ажыццяўляўся кальцавы завоз фільмаў, што намнога скароціць транспартныя выдаткі.

У нас яшчэ поўнасцю не вырашана пытанне з будаўніцтвам кінаапаратных, якія б адпавядалі ўсім тэхнічным патрабаванням бяспекі. У Мінскай вобласці, напрыклад, пабудавана 525 кінаапаратных, аднак толькі 273 прынята камісіямі, астатнія патрабуюць значна лепшага абсталявання.

Абавязак кінамеханікаў дэманстраваць не толькі мастацкія фільмы, але і навукова-папулярныя, сельскагаспадарчыя. Між тым, прапаганда сельскагаспадарчых фільмаў у многіх раёнах рэспублікі арганізавана слаба. Нядаўна калегія Міністэрства культуры заслухала справаздачу Віцебскага абласнога ўпраўлення культуры па гэтаму пытанню. Выявілася, што ў гэтай справе ў раёнах вобласці ёсць многа істотных недахопаў. Умела наладжаная прапаганда сельскагаспадарчых фільмаў дапаможа працаўнікам калгаснай вёскі завяваць высокія ўраджаі, дабіцца новых поспехаў у жывёлагадоўлі.

Кожны дзень набліжае нас да вялікай знамянальнай падзеі — 40-годдзя БССР. Увесь беларускі народ рыхтуе да свайго нацыянальнага свята працоўныя падарункі. І кінафікатары рэспублікі павінны прыкласці ўсе намаганні, каб з чэсцю выканаць узятыя абавязацельствы. Варта таксама наладзіць фестывалі фільмаў беларускай кінастудыі, перад пачаткам сеансаў праводзіць гутаркі і даклады аб дасягненнях беларускага савецкага кінамастацтва.

Кіно — самае масавае з усіх відаў мастацтва,— гаварыў Ул. І. Ленін,— і трэба зрабіць усё магчымае, каб нашы цудоўныя фільмы глядзелі ў самых аддаленых кутках нашай рэспублікі, каб яны спрыялі росту культуры беларускага народа.

Пачаліся гастролі Вінніцкага тэатра

3-га ліпеня ў Мінскім акруговым Доме афіцэраў Вінніцкі тэатр паказаў свой першы спектакль «Ноч і полымя» па п'есе вінніцкага драматурга М. Заруднага. Спектакль, прысвечаны саракавой гадавіне Кастрычніка, раскрывае на сцэне старонкі гераічнай барацьбы ўкраінскага народа з буржуазна - нацыяналістычнай «Цэнтральнай радай» у 1918 годзе.

Спектакль пастаўлены галоўным рэжысёрам тэатра, заслужаным дзеячом мастацтва УССР Ф. Варашчагіным, які перадаў гледачам беларускай сталіцы палымяне прывітанне ад калектыву тэатра.

У канцы спектакля на сцэну ўзняліся з кветкамі ў руках прадстаўнікі тэатральнай грамадскасці Мінска. Народная артыстка БССР В. Галіна павіншавала ўкраінскіх гасцей з адкрыццём гастролей у Мінску і пажадала ім творчага поспеху.

Спектакль «Ноч і полымя» цёпла сустрэты гледачамі.

Гомель сёння. Жылыя дамы на Камсамольскай вуліцы.

Фота М. Мінковіча.

НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ БССР

Следуюць добраму прыкладу

Толькі дзве буйныя брыгады ў сельскагаспадарчай арцелі імя Леніна Чавускага раёна. І размешчаны яны ў вёсках Дрокаўка і Рымінка, якія знаходзяцца далекавата адна ад другой. Аднак клубаў у гэтых вёсках не было. І вось аднойчы ў час пасяджэння праўлення паштальён прынёс газеты. Член праўлення камуніст Яўген Віктаранка прачытаў у газеце аб пачыне калгаснікаў Кіраўскага раёна. Кіраўцы вырашылі да 40-годдзя Беларускай ССР пабудаваць клубы ў кожнай паляводчай брыгадзе.

— Я думаю, што варта і нам паследаваць добраму прыкладу, — выказаў ён сваю думку.

Такая прапанова зацікавіла прысутных. І адразу ў парадак дня пасяджэння было ўнесена новае пытанне: пачын кіраўцаў.

Раіліся доўга, пакуль не пагадзіліся на адзінай думцы: да свята пабудаваць у кожнай брыгадзе свой клуб.

Канцылярыя калгаса дагэтуль займала прасторны будынак, лепш за ўсё пераабсталяваць яго пад клуб, а для канцылярыі пабудаваць новы, меншых памераў.

Дружна ўзяліся калгаснікі другой брыгады за работу. За кароткі тэрмін яны капітальна адрамантавалі будыніну, уставілі новыя вокны і дзверы, атынкавалі і пабялілі сцены, абсталявалі сцэну. Да будынка прыбудавалі апаратную. Знайшліся мясцовыя мастакі, якія з любоўю афармілі глядзельную залу. Цяпер у новым клубе кожны вечар многа людзей. Калі год назад у Дрокаўку не жадалі заглядваць лектары і дакладчыкі, то цяпер тут не менш двух-трох разоў у месяц чытаюцца лекцыі і даклады. У клубе заўсёды можна пачытаць свежую газету і часопіс, абмяняць кнігу. Часта дэманструюцца кінафільмы.

І самадзейнасць сваю арганізавалі. Спачатку загадчыца Прудкаўскай сельскай бібліятэкі Ефрасіння Князева запісала ў харавы гурток першых дзесяць юнакоў і дзяўчат. Цяпер у мастацкай самадзейнасці ўдзельнічае каля 30 чалавек. Сярод іх аграном Сцяпан Патапенка, матарыст Міхал Малахаў, заатэхнік Соф'я Жыжкіна, настаўнік Леанід Куфчанкаў і многія іншыя. Самадзейныя артысты паспелі ўжо некалькі разоў выступіць на сцэне свайго клуба і танцаў канцэрты ў суседніх сельгасарцелях.

Па прыкладу дрокаўцаў узяліся за будаўніцтва свайго клуба і калгаснікі вёскі Рымінка. Праўда, ім крыху цяжэй, бо клуб прыходзіцца ўзводзіць на новым месцы. Але жаданне не адстаць ад суседзяў надало энергіі людзям. У цэнтры вёскі Рымінка ўжо ўзвышаецца зруб прасторнага клуба, будаўніцтва якога закончыцца ў бліжэйшы месяц. Толькі будуюць рымінскія жыхары з размахам. Калі глядзельная зала клуба ў Дрокаўцы разлічана на 120 месц, то ў Рымінцы яна будзе ўдвая прасторней.

У народзе гавораць, што добры пачатак — палавіна справы. Так яно атрымалася і на самай справе. Пачалося будаўніцтва клуба ў Дрокаўцы, а следам за гэтым калгаснікі задумалі і свой радыёвузел мець, і электрычнае святло. Цяпер у клубе і ў дамах калгаснікаў гаворыць радыё. На цэнтральнай сядзібе працуе дызельны рухавік калгаснай электрастанцыі, і электраманцёры пацягнулі першыя правады ў дамы калгаснікаў.

М. АНЮКОЎ.

Узмацніць падрыхтоўку да свята

НА КАЛЕГІІ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

На пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры БССР абмеркавана некалькі пытанняў работы устаноў культуры па выкананню ўзятых сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 40-годдзя нашай рэспублікі.

Пры разглядзе становішча работы культасветустаноў Высокаўскага раёна Брэсцкай вобласці было адзначана, што ў гэтым раёне яшчэ слаба рыхтуюцца да свята беларускага народа. Хоць асобныя сельскія ўстановы культуры і прарабілі тут сёе-тое — ажывілі дзейнасць самадзейных калектываў, больш сталі чытаць лекцый і дакладаў, павялічылі колькасць чытачоў бібліятэк, у цэлым жа па раёну работа па падрыхтоўцы да свята разгортваецца марудна і нездавальняюча. Ва ўстановах культуры раёна адсутнічае належная наглядная агітацыя, яны не наладзілі шырокую прапаганду дасягненняў, а таксама тых задач, якія стаяць сёння перад працаўнікамі вёскі і горада. Раённы Дом культуры не зрабіўся сапраўдным метадычным цэнтрам і арганізатарам цікавых мерапрыемстваў. Яго работнікі рэдка выязджаюць у вёскі, не аказваюць нізавым калектывам патрэбнай дапамогі. Не лепш працуюць і бібліятэкі раёна. Ні адна з іх не давяла кнігу да кожнага калгаснага двара. Бібліятэкі не арганізавалі кніганошаства, амаль не папаўняюцца новай літаратурай. Больш як у сарака населеных пунктах раёна не дэманструюцца кінафільмы з прычыны адсутнасці закрытых месц кінапаказу. Калегія Міністэрства абавязала раённы аддзел культуры і яго загадчыка тав. Чыквіна прыняць неадкладныя захады дзеля выпраўлення становішча, разгарнуць шырокую падрыхтоўку да юбілею рэспублікі.

На пасяджэнні была абмеркавана работа Чачэрскага раённага аддзела культуры (Гомельская вобласць) па абслугоўванню кнігай насельніцтва. Са справаздачы загадчыка аддзела тав. Дворкіна і з матэрыялаў праверкі стала відаць, што гэтая работа ў Чачэрскім раёне па-сутнасці толькі яшчэ распачынаецца. Бібліятэчнай кнігай тут ахоплены 65 працэнтаў калгасных двароў. Сярод чытачоў — пераважна моладзь і школьнікі, даросласа ж насельніцтва мала. Абарачальнасць кніжнага фонду нізкая. Для папаўнення яго не прыцягваюцца сродкі калгасаў, некалькі калгасных бібліятэк за апошнія часы зусім перасталі функцыяніраваць. У існуючых бібліятэках раёна ў хаатычным становішчы знаходзяцца кніжныя фонды, не вядуцца каталагі, няма належнага ўліку набытай літаратуры. Бібліятэкі дрэнна займаюцца прасоўваннем кніг у масы на грамадска-палітычныя, сельскагаспадарчыя і навукова-прыродазнаўчыя тэмы, слаба прапагандуюць творы беларускіх пісьменнікаў. Як выявілася, значная віна ў гэтым і Гомельскага абласнога бібкалектара, які дрэнна забяспечвае бібліятэкі раёна навінкамі літаратуры, асабліва беларускай. Адзначаныя недахопы, як указваецца ў рашэнні калегіі Міністэрства культуры БССР, павінны быць у бліжэйшы час выпраўлены работнікамі культуры Чачэрскага раёна.

У канцы гэтага года ў Мінску будзе наладжана рэспубліканская выстаўка народнай творчасці. Задумана яна як шырокае мерапрыемства. Мяркуецца, каб на выстаўцы экспаніраваць больш адной тысячы работ. Ёсць усе магчымасці ўзорна падрыхтавацца да яе. У рэспубліцы на сённешні дзень выяўлена больш 3 200 майстроў народнай творчасці і самадзейных мастакоў. Народныя ўмельцы пакажуць на раённых і абласных выстаўках шэраг тэматычных разных, інкруставаных, тканых і вышываных работ, тэматычных кампазіцый, драўляных скульптур, шкатулак, партрэтаў, ручнікоў, посцілак, жывапісных партрэтаў перадавікоў вытворчасці, пейзажаў з выдатнымі мясцінамі рэспублікі, твораў, якія адлюстроўваюць важнейшыя старонкі гісторыі Савецкай Беларусі. Акрамя таго, пры абласных, гарадскіх і раённых дамах культуры ў разнастайных гуртках рыхтуецца шэраг калектыўных работ. Народным умельцам ужо аказана на месцах некаторая дапамога: у асобных абласцях праведзены з імі семінары, арганізаваны выезды да майстроў самадзейнага мастацтва прафесіянальных мастакоў, метадыстаў і пазаштатных кансультантаў. Разгледзеўшы першыя вынікі праробленай работы, калегія Міністэрства культуры БССР абавязала ўпраўленні культуры і дамы народнай творчасці ўзмацніць падрыхтоўку да выставак. Усюды неабходна правесці творчыя семінары з народнымі ўмельцамі, даць ім належныя кансультацыі і парады, прыцягваючы да гэтай работы майстроў прафесіянальнага выяўленчага мастацтва. Трэба прыняць усе захады, каб раённыя і абласныя выстаўкі найбольш поўна адлюстравалі багацце і яркасць самадзейнага мастацтва нашага народа. Ад таго, як паспяхова будуць падрыхтаваны і праведзены выстаўкі ў раёнах і абласцях, будзе залежыць і поспех Усебеларускай выстаўкі. Калегія Міністэрства культуры БССР стварыла аргкамітэт, вызначыла канкрэтныя мерапрыемствы па арганізацыі і правядзенню рэспубліканскай выстаўкі народнай творчасці, прысвечанай 40-годдзю БССР.

На беразе Ушы

Нядаўна ў нядзелю з самага ранку да вёскі Турэц-Баяры Заскавіцкага сельсавета адна за другой пачалі пад'язджаць аўтамашыны, поўныя радаснага гоману, песень. Сюды, у маляўнічы куток сасновага бору, на беразе рэчкі Ушы, збіраліся з усяго Маладзечанскага раёна госці--працаўнікі калгасаў і саўгасаў, каб адзначыць сваё традыцыйнае свята Працы. Гасцей сабралася каля трох тысяч чалавек. Радасныя, шчаслівыя людзі з'ехаліся сюды, каб пагаварыць аб сваіх працоўных поспехах, планах на будучае, нарэшце, каб весела правесці выхадны дзень.

Свята адкрыў першы сакратар райкома партыі тав. Рыбачонак. Ён павіншаваў прысутных са святам, з паспяховым завяршэннем веснавых палявых работ. Потым выступіў старшыня райвыканкома тав. Ліхач, які расказаў аб поспехах паляводаў, жывёлаводаў калгасаў і саўгасаў раёна.

Бурныя апладысменты прысутных выклікала выступленне камсамолкі звенявой па кукурузе арцелі імя Янкі Купалы Ніны Пляскач. Яна расказвала аб працы сваіх таварышаў.

Аб справах і людзях калгаса імя Леніна расказаў старшыня гэтай арцелі тав. Севярын. У сацыялістычным спаборніцтве раёна калгас займае першае месца.

І вось адзін за другім падыходзяць лепшыя людзі, перадавікі калгаснай вытворчасці да аднаго са столікаў, дзе ім уручаюцца прэміі. Усяго на свяце працы было ўзнагароджана каля 500 чалавек.

Абласное ўпраўленне культуры прэміравала падшэфны калгас «Герой працы» радыёлай і бібліятэчкай.

З вялікім поспехам на свяце выступілі калектывы мастацкай самадзейнасці раёна.

Т. ЗАЛЕСКАЯ.

Праект помніка М. І. Калініну, які будзе ўстаноўлены на плошчы, названай яго імем, у Мінску. Скульптар А. Глебаў.

Фота Ул. Крука.

На гастролях у Ленінградзе

Операй «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага пачаў свае гастролі ў Ленінградзе Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балету.

Са словамі шчырага прывітання да гасцей з Беларусі выступіла салістка Ленінградскага тэатра оперы і балету імя С. Кірава, народная артыстка РСФСР А. Халілеева. Яна ад душы падзякавала ўдзельнікам спектакля за высокае прафесіянальнае майстэрства і пажадала ўсяму калектыву тэатра далейшых поспехаў у правядзенні гастроляў у Ленінградзе.

Са словам у адказ выступіла народная артыстка СССР Л. Александроўская.

З поспехам прайшлі ў Ленінградзе спектаклі «Манон» і «Шукальнікі жэмчугу», балеты «Лебядзінае возера» і «Блакітны Дунай».

На першых спектаклях Беларускага опернага тэатра пабывала звыш 6000 ленінградцаў.

Сустрэча пісьменнікаў з воінамі

Вечар, прысвечаны 40-годдзю Беларускай ССР, адбыўся днямі ў Н-скай часці. На ім прысутнічалі ваеннаслужачыя і члены іх сем'яў, госці з іншых падраздзяленняў.

Удзельнікам вечара было расказана пра тое, якія дасягненні мае беларуская літаратура за гады Савецкай улады.

Затым пісьменнікі і паэты выступілі з чытаннем твораў.

Паэтэса Еўдакія Лось прачытала вершы «З маёй біяграфіі», «З лета», «Тры добрых справы», «Песня Нутфулы» і іншыя.

Пісьменнік Яўхім Садоўскі прачытаў урывак з аповесці «Нябачны фронт», над якой ён цяпер працуе, і апавяданне «Скрыпач».

Вершы на ваенныя тэмы прачытаў паэт Наум Кіслік: «Вакзалы ваеннага часу», «Цішыня за сцяной», лірычныя вершы «Неба і зямля», «Пра каханне» і інш.

Удзельнікі вечара горача падзякавалі пісьменнікам за цікавыя выступленні.

Я. МАЛЫ.

Рэспубліканская нарада работнікаў архіваў

На працягу трох дзён у Мінску праходзіла рэспубліканская нарада работнікаў архіваў рэспублікі, прысвечаная 40-годдзю архіўнага будаўніцтва СССР.

На нарадзе былі зроблены даклады «Архіўнае будаўніцтва ў БССР і перспектывы яго развіцця», «Партархівы Камуністычнай партыі Беларусі да 40-годдзя ленінскага дэкрэта аб архіўным будаўніцтве», «Арганізацыя работы па мікрафотакапіраванню дакументальных матэрыялаў» і іншыя. Выступаўшыя ў спрэчках унеслі рад прапаноў па паляпшэнню работы архіваў рэспублікі, абмяняліся вопытам.

Удзельнікі нарады зрабілі экскурсію ў Дзяржаўны мастацкі музей, пазнаёміліся з выстаўкай, прысвечанай архіўнаму будаўніцтву ў БССР.

Песні росных лугоў

Разам з машынай з-за павароткі дарогі з'явілася і песня. Бойкая, вясёлая, задорная, яна адразу абудзіла вёскі, пранеслася ціхай вуліцай, заляцела і на брыгадны двор, дзе жанкі збіраліся ехаць сушыць сена.

Каля млына, каля млына
Расцвіла каліна, —

зацягваў нейчы тонкі, з аксамітнымі пералівамі голас і адразу ж яго падхоплівалі астатнія дзяўчаты. Песня адразу ўзлятала вышэй, звінела срэбрам:

Там дзяўчына ваду брала
Сама чарнабрыва...

Старая жанчына, якая выбегла на вуліцу, каб засцерагчы сынавых дзяцей ад машыны, гукнула сваёй суседцы, што сядзела насупраць на лаўцы:

— Глінішчанцы ўжо на сенажаць паехалі. А нашы ўсё ніяк не могуць сабрацца.

Адкуль яна пазнала, што гэтыя дзяўчаты, якія паехалі на машыне,—з вёскі Глінішчы? Яна ж выйшла, калі машына пыліла ўжо ў канцы вуліцы.

Ды ўсё ж пазнала. І пазнала па песнях, якія спяваюць толькі ў гэтай мясцовасці. Песні гэтыя зжыліся з шырокімі палямі, перамежаванымі густымі лясамі і топкімі балотамі, зрадніліся з сінімі ільнамі, налітымі жытамі, з роснымі лугамі. Песню пяюць тут спрадвеку. Спявалі дзяды, бацькі, а цяпер яна прышлася да спадобы і іх дзецям. І дзеці надалі ёй, шчырай мясцовай песні, свой новы сэнс. Яны самі стварылі вясковы хор, які спявае гэтую песню, што дасталася ім у спадчыну. Дарагую сэрцу песню аб нівах, дубровах, аб ясным сонейку. У ёй само жыццё, радасць дзяцей і ледзь заўважна чуваць колішняе гора іх бацькоў і дзядоў.

Потым песні аб роднай старонцы пачалі спяваць на вечарах мастацкай самадзейнасці, на святах. Яны надта падабаліся людзям. І дзяўчаты спявалі.

Крыху пазней дзяўчаты павезлі свае песні ў Хойнікі на агляд мастацкай самадзейнасці. Усе яны, трыццаць прыгожых глінішчанскіх дзяўчат, спявалі перад слухачамі раённага цэнтра. Спявалі ў нацыянальных беларускіх вышываных сукенках, у вяночках вясны і маладосці, зробленых з лугавых красак. Ужо тады правільна заўважылі людзі, што гэты хор сапраўды народны. Ён жа спявае народныя песні, якія штодзённа чуюць людзі гэтай мясцовасці. Адсюль, з Хойнік, яны вазілі сваю народную песню ў Гомель на абласны агляд мастацкай самадзейнасці. Там таксама прыхільна сустрэлі глінішчанцаў.

А хор стварыўся нядаўна. Усяго толькі пяць гадоў назад. Дапамагла арганізаваць яго Юля Мележ. Дзяўчаты з ахвотай пачалі наведваць рэпетыцыі, бо песні гэтыя яны чулі змалку, ад самай калыскі. А цяпер дзяўчат ужо вунь чалавек трыццаць у хоры ёсць. Толькі адных Кудрыцкіх больш дзесяці збярэцца. Любяць песню ўсе яны— і Соня, і Ліда, і Волька, і Зіна, і Маня, і Ніна Кудрыцкія. Ніколі не расстаюцца з песняй Маня Дубадзел, Волька Бондар, Люба Сянько, Марыя Касцючэнка. Ды ці толькі адны яны. Усе дзяўчаты глінішчанскія без песні кроку не ступяць.

А Зося Ліпніцкая заўсёды з сумам праводзіць сяброўак на сенажаць. Яна ведае, што там, дзе збіраюцца амаль усе дзяўчаты з хору, будзе весела. І, вядома, без песні там не абыйдзецца. Толькі ёй нельга быць на сенажаці разам з дзяўчатамі. Яна свінарка і для яе галоўнае—ферма. А як хочацца пабыць разам з усімі! Цягне туды і Марыю Кудрыцкую, якая працуе ў канцылярыі калгаса, і Ніну Бельскую, настаўніцу Глінішчанскай школы, і Ганну Сераду, піянерважатую. Дык яны ў вольную часіну і бягуць на луг дапамагчы сяброўкам.

А на сенажаці сапраўды весела. Дзяўчаты працуюць дружна, спорна. Варочаюць пракосы, зграбаюць сена ў копы. Асабліва весела бывае ў час адпачынку, ці тады, калі ўсе садзяцца за полудзень. Сенажаці ж знаходзяцца далёка і дадому ніхто не ідзе. Яны развязваюць свае клуначкі, якія да гэтага вісяць на голлі дрэў, і палуднуюць.

А пасля гэтага дзяўчаты збіраюцца ў кружок пад высокім разгалістым дубам. Дубу таму гадоў трыста і пад ім ценю для ўсіх хопіць.

— Што заспяваем, дзяўчаткі?—пытаецца Люба Чарняк.

На выгляд яна вельмі сур'ёзная, і таму яе ўсе слухаюць, усе паважаюць.

— Давайце «Ой, у полі ніўка»,—борздзенька кажа Галя Бондар, чарнявая дзяўчына з разумным і глыбокім позіркам вачэй.

— Сапраўды, давайце нашу «Ніўку»,— падтрымліваюць яе астатнія.

І песня ўзлятае ў паднябессе.

У агародзе буракі,
Чырвоная жычка.
Любяць мяне, мама, хлопцы,
Хоць я невялічка.

Жартоўная песня захоплівае ўсіх. Нават старыя жанчыны не ўтрымліваюцца і пачынаюць падпяваць дзяўчатам:

Хоць я невялічка,
Хоць я нехароша.
Возьмуць мяне, мама, хлопцы
Без аднога гроша.

Ціха слухае дзявочыя песні дуб. Нават ветрык, здаецца, кладзецца адпачыць недзе паблізу ў кустах, змаўкае, прыслухоўваецца. Напэўна, заслухаўся гэтай песняй і бусел, які высока, у ледзь захмураным белым кужалем воблакаў небе распластаў свае крылы. Распластаў, і плыве ціха, павольна. Здалёк прыслухоўваюцца да песні калгаснікі другога калгаса, сенажаць якога вось тут побач.

— Ціха, жанчынкі!—кажуць там.— Чуеце глінішчанцы спяваюць. Можа паслухаем?

І слухаюць. А песня гучыць усё званчэй і званчэй, набірае сілы. Тут, на сенажаці праходзіць як бы своеасаблівая рэпетыцыя. Яна прадаўжаецца потым вечарам у прасторным калгасным клубе.

У гэты ж дзень пасля работы рэпетыцыі не было. Яе правялі ўчора. А сёння намечана выехаць з канцэртам у вёску Бярозаўка, што знаходзіцца ў суседнім Калінкавіцкім раёне. Прыехаўшы з сенажаці, дзяўчаты пераапраналіся і адразу ж спяшаліся ў клуб.

Маня Кудрыцкая ўвесь час падганяла Вольку:

— Хутчэй ты збірайся, а то дзяўчаты ўжо ўсе ў клубе. А ты капаешся. Спознімся яшчэ.

— Манечка, пачакай, апошнюю заколку да ладу прывяду.

Калі яны прышлі ў клуб, дзяўчаты былі ўжо ў зборы. Прышоў праводзіць у госці дзяўчат і фельчар Аляксей Бельскі. Раней ён таксама спяваў у хоры.

— Ты, можа, Лёша, сёння з намі зноў паедзеш? Хоць для абароны б адзін хлопец быў,—пажартавала Галя Бондар.

— Дзе яму! Раней жа ён халасцяком быў, дык добра яму тады было спяваць. А цяпер жонка ўжо яго не пусціць,—падтрымала сяброўку Зіна Кудрыцкая.

Дзяўчаты засмяяліся. Аляксей нешта хацеў адказаць ім, таксама, мусіць, жартам, але машына кранулася і пабегла, узяўшы кірунак да шляху.

Кліча маці вячэраці,
А дачка не хоча,—

заспявалі дзяўчаты. А жанчына, якая стаяла каля клуба, пра сябе казала:

— От няма на іх угамону. Толькі з работы прыбягуць і адразу ж у свой клуб спяшаюцца. Ні паесці ніколі ў часе, ні пасядзець з маці,—усё ў клуб ды ў клуб. А ты чаго глядзіш так услед ім?—запытала яна раптам у фельчара, які ўсё яшчэ нерухома стаяў і глядзеў, як аддалялася машына.—Можа і цябе, жанатага, няўседкі бяруць?

— Гляджу вось, цётка, і думаю... Аднаму мне ехаць не з рукі... А ці не сагітаваць мне сваю жонку ў гэты хор?

Цётка пайшла, а Аляксей усё яшчэ стаяў, пакуль машына не знікла і пакуль не заціхла родная, бліжэйшая песня.

Але яна не заціхла. Яна толькі паплыла далей, трапечучы ў паветры, напоўненым сенным настоем, зліваючыся і дапаўняючы музыку паволі наступаўшага летняга надвячорка.

І. СІПАКОЎ.

Калгас «Ленінскі шлях», Хойніцкі раён.

Высокае майстэрства перакладу

У творчай спадчыне Янкі Купалы вялікае месца займаюць мастацкія пераклады. Беларускі пясняр перакладаў з рускай, украінскай і польскай моваў; перакладаў вершы, драматычныя творы, прозу. Займаўся перакладамі ён на працягу ўсяго творчага шляху: першыя пераклады датуюцца 1905 годам, апошнія—1940 г. Янка Купала перакладаў творы Пушкіна, Някрасава, Шаўчэнкі, Міцкевіча, Канапніцкай, Кандратовіча і многіх іншых рускіх, украінскіх і польскіх пісьменнікаў, а таксама зрабіў празаічны і вершаваны пераклады вялікага літаратурнага помніка славянства — «Слова аб палку Ігаравым». Пераклады Я. Купалы—нагляднае сведчанне творчых сувязей беларускага паэта са славянскімі літаратурамі.

Вялікае значэнне мае перакладчыцкая дзейнасць Янкі Купалы ў гісторыі развіцця беларускай літаратуры і фармаванні літаратурнай мовы. Праца над перакладамі была не толькі школай паэтычнага майстэрства для беларускага паэта, які авалодваў багаццямі класічнай спадчыны. Ён знаёміў беларускага чытача з лепшымі творамі рускіх, украінскіх і польскіх паэтаў, узбагачаў айчынную культуру, расшыраў яе гарызонты.

У той час, калі з'явіліся першыя купалаўскія пераклады твораў Някрасава, Шаўчэнкі і Міцкевіча, беларуская літаратурная мова яшчэ знаходзілася ў стадыі фармавання і станаўлення. Гэта акалічнасць патрабавала ад перакладчыка надзвычайнага майстэрства славатворчасці, бо трэба было ў лексіцы роднай мовы адкрываць новыя сэнсавыя адценні і інтанацыі, ствараць крылатыя словы, ідыёмы і выразы, каб перадаць усё багацце і своеасаблівасць паэтычных вобразаў арыгінала.

Работа над перакладамі была адказам ворагам беларускай літаратуры і скептыкам, якія не верылі ў яе будучае. Купала даказаў, што на беларускай мове гэтак жа паэтычна, эмацыянальна, узнёсла могуць гучаць, захоўваючы ўсю сваю прыгажосць і чароўнасць, творы і Пушкіна, і Шаўчэнкі, і Міцкевіча.

Вялікую любоў і пільную ўвагу да лепшых твораў рускай класічнай паэзіі Я. Купала пранёс праз усё сваё жыццё і творчасць.

Народны паэт праяўляў яшчэ ў дзяцінстве вялікую цікавасць да творчасці Пушкіна і Лермантава, а таксама да паэзіі Някрасава і Кальцова. Пасля ў аўтабіяграфічных матэрыялах Я. Купала пісаў: «Кніга, у якой гаварылася пра цяжкую долю беднага народа, заўсёды мяне хвалявала. З гэтага, вядома, вынікае, што такія аўтары, як ...Някрасаў, Кальцоў мяне больш за ўсё цікавілі». Гэта акалічнасць у значнай ступені вызначыла творчыя інтарэсы Я. Купалы-перакладчыка.

Я Купала быў першым перакладчыкам на беларускую мову твораў Някрасава і Кальцова. Не выпадкова і тое, што сярод купалаўскіх перакладаў твораў рускіх паэтаў першае месца па колькасці і аб'ёму займае Някрасаў.

Трэба адзначыць, што самыя ранніе пераклады песень з паэмы «Каму на Русі жыць добра»—«Галодная» і «Салёная» (пераклады датуюцца 1905 г.) вызначаюцца глыбокім пранікненнем у арыгінал, тонкім адчуваннем аўтарскай задумы. Майстэрства Купалы-перакладчыка перш за ўсё ў тым, што ён галоўную ўвагу звяртае не на асобныя дэталі, а ўмее перадаць цэласнае ўражанне. Тут няма сляпога капіравання арыгінала, абавязковых пошукаў адпаведных лексічных эквівалентаў у беларускай мове кожнай някрасаўскай метафары, кожнаму паэтычнаму вобразу. Больш таго, у купалаўскім перакладзе прыдзірлівы педант і прыхільнік «літаральнага» перакладу можа ўбачыць «адступленні» ад арыгінала:

У Някрасава:	У перакладзе:
Темней лица	Глядзіць вачмі
Стеклянного	Слязлівымі,
Не видано	Сапе грудзьмі
У пьяного.	Удушлівымі.

Але гэтае адступленне зроблена ў імя захавання найбольш істотнага—ідэйнай задумы песні, дзе створаны вельмі яркі і жывы вобраз селяніна-бедняка. Што было б, калі б перакладчык перадаў усе знешнія дэталі арыгінала, без творчага асэнсавання? Мы мелі б якраз той выпадак, аб якім вельмі ўдала сказаў савецкі перакладчык І. Кашкін: «Можна сабраць у перакладзе ўсе дэталі, але яны застануцца ў ім слоўным смеццем альбо вадой, ад якой адсырэе парахавы зарад».

Купала не стаў інвентарызаваць усе дэталі, і «парахавы зарад» у перакладзе застаўся сухім, бо яму была знойдзена трапная замена, якая не аслабіла ўражання, а, наадварот, узмацніла яго («слязлівыя вочы», «удушлівыя грудзі»).

Творчы падыход, пошукі паэтычнага вобраза, калі не поўнасцю адпаведнага, дык блізкага па свайму сэнсу, ёсць у кожнай страфе перакладу. Купала знаходзіць такія сродкі і дэталі, якія захоўваюць у перакладзе галоўнае,—даюць той эфект, што і аўтарскі вобраз:

Ковригу съем	Хоць бы з гару
Гора горой,	Акраец з'ем
Ватрушку съем	Ды й праснакоў
Со стол большой,	Адразу з сем.

Такая творчая перадача асновы арыгінала ёсць у перакладах не толькі песень «Галодная» і «Салёная». Ва ўрыўку «У людзей і ў нас» (у арыгінале: «У людей-то в дому—чистота, лепота...») перакладчык таксама адступае ад малазначных дэталей, у цэнтры яго ўвагі глыбокі мастацкі вобраз, пабудаваны на антытэзе:

У людзей у хаціне—прастор, чыстата,
А ў нашай курной—цемната, цесната.
А ў людзей і ў пост сала повен гаршчок,
А ў нас і ў нядзелю алей ды часнок.

Захаваўся незакончаны пераклад вядомага верша Някрасава «Нязжатыя гоні». З трыццаці радкоў гэтага, аднаго з лепшых някрасаўскіх твораў, Купала пераклаў толькі чатырнаццаць. У перакладзе выразна перададзены непаўторны каларыт верша:

Шэпча, здаецца, там з коласам колас:
— Нудна нам слухаці восені голас,
Нудна хіліцца да самай зямлі,
Спелае зерне купаць у раллі.

Гэта без перабольшання новае жыццё някрасаўскага верша. У перакладзе захаваны і перададзены асабліваці некрасаўскага верша наогул і яго гукавая інструментоўка ў прыватнасці—алітэрацыі, якія перадаюць трывожнае шаптанне калоссяў на пакінутай ніве:

Кожную ночку ў нас толькі начуюць
Дзікія птушкі і злосна руйнуюць,
Заяц нас топча, віхура нас бье...
Дзе ж гэта сейбіт? Чаму жаць не йдзе?

Някрасаўскія матывы (нязжатая паласа як сімвал народнай нядолі, вобраз селяніна, які падарваўся ад непасільнай працы) атрымлівае далейшае развіццё ў лірыцы Я. Купалы. У вершах «Над нівай у непагоду» і «Жніво» беларускі гусляр па-свойму асэнсоўвае гэтую тэму:

Наспелая постаць шчаслівых пасеваў
За вёскай на сонным лясоў рубяжы,
Сцвелы ўжо колас схінула к мяжы
У сумным шаптанні: «Дзе, жнеі мае, вы?»
(«Жніво»).

Але далей Купала гаворыць, што «жніўныя вечна старыя напевы» надаюць сілы чалавеку і ставяць перад ім пытанне востра-сацыяльнага зместу:

Плыве гэта песня ка мне і заве,
І ў сэрцы звініць, як каса у траве:
«Ты так жа, брат, сееш..., а дзе тваё жніва?»

Работа над перакладамі адкрывала перад беларускім паэтам усё багацце і разнастайнасць пафасу паэзіі Някрасава, яе сувязь з народнымі крыніцамі. Перакладчыцкая дзейнасць Я. Купалы была цесна звязана з яго творчасцю, дапамагала яму авалодаць некрасаўскімі традыцыямі. Часам пераклад твораў Някрасава быў своеасаблівым падрыхтоўчым этапам, заахвочваннем да ўласнага водгуку і стварэння свайго твора на гэтую тэму.

Адразу пасля работы над перакладам некрасаўскага «Агародніка» Купала рэалізуе свой замысел—піша паэму «Адплата кахання». Хоць у аснову купалаўскай паэмы пакладзены жыццёвы факт—здарэнне, якое адбылося на Лагойшчыне, каля вёскі Гайна, нельга не заўважыць тут творчага ўплыву Някрасава.

Перакладаў Я. Купала таксама вершы вядомага рускага паэта А. Кальцова. Багацце і своеасаблівасць, прастата і наватарства паэзіі А. Кальцова былі звязаны з фальклорнымі традыцыямі, з народнай песняй, тымі крыніцамі, якія асабліва блізкія былі ранняму Купалу.

У дарэвалюцыйнай творчасці Я. Купалы ёсць вершы, якія пераклікаюцца з творамі А. Кальцова не толькі сваёй тэматыкай, але і песенным складам, сваёй рытмікай («З песень нядолі», «Поле роднае», «Заход сонца», «На сенажаці» і інш.). Але беларускі пясняр разумеў, што творам Кальцова не хапае грамадскага гучання, сацыяльнага пратэсту. Купала ідзе непараўнальна далей рускага паэта.

Вось для параўнання вершы «Што ты спіш?» Я. Купалы і «Што ты спіш, мужычок?» А. Кальцова. У рускага паэта—гэта папрок селяніну, які страціў сілу і веру ў будучае, згалеў і з гора апусціў рукі, хоць раней меў дастатак і павагу. Купалаўскі верш меў шырокае грамадскае гучанне, быў заклікам да беларускага народа ўзняцца на барацьбу за свае сацыяльныя і нацыянальныя правы:

Калі стрэльбу ў цябе
Адабралі тваю,
Ты з застрэшку вазьмі
Касу востру сваю!

У творчай спадчыне Купалы водгукі кальцоўскага верша чуваць таксама ў паэме «Адвечная песня» (раздзел «Вясна»). Па матывах яго напісаны ў 1924 г. сатырычны верш-пародыя «Што ты спіш? Па Кальцову», накіраваны супраць няўдалых гаспадарнікаў з Белдзяржвыдавецтва. Першыя дзве страфы ў гэтым творы—пераклад верша Кальцова (толькі замест зваротка «мужычок» у арыгінале, у Купалы «Госіздат»), а далей здзеклівая сатыра:

Што ты спіш, Госіздат?
Бач, вясна на дварэ,
І суседзі твае
Ужо працуюць даўно.
. . . . . .
Замест кніжак для школ
Бланкі шлёпаеш ты,
А пацехі ад іх
Ні табе, ні людзям.

Аднак Купала не толькі творча выкарыстоўваў творы А. Кальцова, але і непасрэдна займаўся перакладамі іх на беларускую мову. Пераклад верша «Гасцінец» (у арыгінале «Путь»)—адзін з лепшых купалаўскіх перакладаў рускай класічнай паэзіі, узор уважлівых і творчых адносін да арыгінала. Перакладчык удала захоўвае думку А. Кальцова, эмацыянальнае гучанне і стыль верша, але ў той жа час у перакладзе мы адчуваем штосьці непаўторнае, **купалаўскае:**

На гады я не стар, —
Звонка песні пяю,
Поўна дум галава,
Поўна сэрца агню.

Гаворачы аб асаблівасцях перакладаў Я. Купалы твораў Някрасава і Кальцова, трэба адзначыць вельмі важны і істотны момант: у іх не адчуваецца слядоў пераадолення цяжкасцей, намаганняў перакладчыка, верш гучыць лёгка і плаўна, а паэтычныя вобразы выступаюць пластычнымі і выразнымі. Гэта сведчанне вялікага майстэрства Я. Купалы-перакладчыка.

З кожным годам расце колькасць перакладаў на беларускую мову твораў рускіх і замежных класікаў, лепшых кніг братніх савецкіх літаратур. Таму вялікую тэарэтычную і практычную цікавасць мае вывучэнне вопыту працы над перакладамі Я. Купалы, выдатнага майстра слова і знаўцы славянскіх літаратур.

С. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

На здымку (справа налева): Я. Купала, П. Тычына, А. Серафімовіч у Кіеве на юбілеі Т. Г. Шаўчэнкі ў 1939 годзе.

Іх першых вітае сонца

Так называецца новая кніга празаіка Антона Алешкі, прысвечаная жыццю і баявой службе савецкіх лётчыкаў. Невялікую кніжку з інтрыгуючай назвай захацелася прачытаць, тым больш, што ў беларускай літаратуры не многа твораў на гэтую тэму.

У кнізе Алешкі дзве невялікія аповесці, героямі якіх з'яўляюцца простыя савецкія людзі. Наогул у нашай савецкай літаратуры з'явілася нямала кніг пра лётчыкаў — людзей адважнай, поўнай рамантыкі прафесіі. Але ўсе яны галоўным чынам адлюстроўвалі слаўныя справы мінулых дзён, калі адважныя сокалы, не шкадуючы свайго жыцця, бясстрашна змагаліся з ворагам. А што чытач ведае пра лётчыкаў мірных дзён, пра іх цяжкую і напружаную вучобу, звязаную часам з вялікай рызыкай, якая патрабуе жалезнай вытрымкі?

Пісьменнік Алешка звярнуўся ў сваіх аповесцях да будняў пасляваеннага жыцця лётчыкаў. Абедзве яго аповесці не вызначаюцца ні складанасцю сюжата, ні кампазіцыйнай пабудовай. Паступова, старонка за старонкай разгортваюцца перад чытачом справы аднаго падраздзялення авіяцыйнага палка. Мы нібы пераносімся на аэрадром, дзе з дня ў дзень адбываецца баявая вучоба, лётныя трэніроўкі і звязаныя з імі трывогі, удачы і памылкі.

Пісьменнік не проста знаёміць нас з людзьмі палка, называючы толькі іх пасады і званні. Людзі, якія дзейнічаюць у аповесцях, нібы арганічна ўваходзяць у творы, і мы непрыкметна пачынаем іх уяўляць, спачуваць ім у хвіліны выпрабаванняў і няўдач, радавацца, калі, ўдасканальваючы свае веды і вопыт, яны атрымліваюць у вучобе поспехі, якія нялёгка даюцца. Важна, што героі аповесці Алешкі маюць кожны свой уласцівы яму характар. Гэта—камандзір палка Загорын, камандзір эскадрыллі Лакціёнаў, малады лётчык Кучынскі... Усе яны розныя па свайму характару, але ўсіх іх мы выразна ўяўляем сабе, нібы даўно з імі знаёмы, бывалі. У навучальных класах, прымалі ўдзел з імі ў навукова-тэхнічных канферэнцыях ці адпачывалі ў цесным коле дзе-небудзь на маёўцы, у гасцінай клуба.

Асабліва запамінаецца лётчык Кучынскі. У авіяцыю ён прыйшоў з вучылішча. Там яму вельмі дасталося: курсанты вучыліся ў абстаноўцы, набліжанай да баявой, памятаючы пры гэтым вядомае суворaўскае правіла: цяжка ў вучобе—лёгка ў баі. Ён закончыў вучылішча выдатна. А вось у практычнай рабоце выяўляецца юнацкая нясмеласць. Яна прыводзіць яго ледзь не да катастрофы. Цяжкі і складаны шлях лётчыка, яго станаўлення. Пісьменнік не стараецца ўпрыгожваць рачаіснасць. Ды і ў гэтым няма патрэбы. З цягам часу малады лётчык, нібы дрэва, пасаджанае на новае месца, пускае свае карані ў калектыў і ў ім прыжываецца. Мы выразна бачым гэта і разумеем, што ў Кучынскага пасля перажытых цяжкасцей з'явяцца новыя сілы для будучых выпрабаванняў.

Праўда, не ўсё атрымалася гладка ў адлюстраванні інтымных перажыванняў героя. Ужо вельмі банальная гісторыя знаёмства Кучынскага з Нінай. Відаць, падвяла паспешлівасць і непрадуманасць, «аб'ектыў» пісьменніка адлюстраваў сцэны жыцця без дастатковай разкасці.

Абедзве аповесці, несумненна, аўтабіяграфічныя. Пісьменнік-урач высока цэніць работу медыкаў, якія аказваюць вялікую паслугу авіятарам, вывучаючы новыя ўмовы палёту і іх уплыў на арганізм. Урач у авіяцыі працуе плячом к плячу з інжынерам, падказваючы часта шляхі тэхнічнага ўдасканалення машын. Па думцы аўтара, сапраўдны авіяцыйны ўрач—гэта чалавек пастаяннай творчай навуковай працы.

І мы бачым такіх людзей (Сабалеўскі — у аповесці «Іх першых вітае сонца», Альшэўскі—у аповесці «Свежы вецер»). Уласна кажучы, аповесць «Свежы вецер» уся прысвечана нялёгкай рабоце авіяцыйнага ўрача Альшэўскага, які ўсе сілы аддае любімай справе і дружнай сям'і лётчыкаў. У гэтай аповесці сутыкаюцца ў асноўным два характары: сумленны, працавіты, чалавек дасціпнай творчай думкі ўрач Альшэўскі і недалёкі пляткар штурман палка Цытвараў, які часова аказаўся на месцы зампаліта. Нават ненадоўга атрымаўшы ўладу, такі, як Цытвараў, паспявае нашкодзіць справе і многім добрым і карысным людзям.

Альшэўскі «ў мірны час займаўся назіраннямі за лётчыкамі, забыўся пра ўласнае жыццё... Спадабаў дружную сям'ю лётчыкаў, якая замяніла яму ўласную сям'ю,..» І гэтая сям'я не дае яго ў крыўду. На партыйным сходзе лётчыкі даюць дастойны адпор паклёпніку Цытвараву, зацвердзіўшы права Альшэўскага займацца навуковымі назіраннямі.

Самая характэрная рыса Альшэўскага—сціпласць. Ён пераканальны тым, што яго станоўчыя якасці не навязчывыя, не падкрэсліваюцца аўтарам як заслуга, а ўспрымаюцца як натуральныя якасці савецкага афіцэра.

Гэтага нельга сказаць пра Цытварава. Ён паказаны ад пачатку да канца тыпам адмоўным, пляткаром, зводнікам, кар'ерыстам, палахлыцам і нават здраднікам (ён пакінуў у хвіліны небяспекі ў час вайны свайго таварыша).

Пісьменнік па абавязку сумлення можа паказваць такіх, як Цытвараў. Яны яшчэ, нажаль, сустракаюцца на нашым шляху, але ў дадзеным выпадку, нам здаецца, яму здрадзіла пачуццё меры. Ужо вельмі доўга такому, як Цытвараў, удаецца хадзіць невыкрытым сярод добрых, сапраўды савецкіх людзей. Ёсць, праўда, у канцы нейкі туманны намёк на нейчае апякунства, але ён нічога не растлумачвае.

Нарэшце, Цытвараў атрымлівае па заслугах, маска сарвана з яго. Але апраўданне Альшэўскага і падзенне Цытварава ў адной кароткай аповесці робіць ураджанне штучнасці, быццам аўтар, як па заказу, спяшаўся хутчэй адзначыць дабрачыннасць і пакараць загану.

Гэтыя няўдачы ў сюжэтнай пабудове аповесці «Свежы вецер», аднак, не могуць зацямніць адной вельмі важнай акалічнасці: добрага ведання матэрыялу, які падаецца чытачу. Прыгадаем хоць бы сцану вучэбнага бою або апісання звычайных дэталей з жыцця лётчыкаў у аповесці «Іх першых вітае сонца». Усё напісана дакладна і добра.

Асабліва карыснай можа быць гэтая кніжка для моладзі, якая выбірае «рабіць жыццё з каго». А. Алешка пераканальна паказаў, што высокія маральныя і фізічныя якасці лётчыка не паяўляюцца самі па сабе, а нараджаюцца ў вельмі ўпартай і карпатлівай рабоце.

М. СТАЛЯРОЎ.

З увагай і клопатам

Жывёла амаль усіх калгасаў Хойніцкага раёна знаходзіцца на далёкіх пашах — на кашарах. Цэлае лета жывуць там і жывёлаводы.

Раённы адзел культуры не пакідае іх без увагі. Заўсёды па два-чатыры разы ў месяц кінамеханікі прывозяць на кашары новыя кінафільмы, якія дэманструюць перад даяркамі і пастухамі. Акрамя гэтага на кашары выязджаюць калектывы мастацкай самадзейнасці калгасаў.

Цяпер у сельгасарцелях раёна распачалося сенакашэнне. Раённы аддзел культуры звярнуў асаблівую ўвагу на культурны адпачынак людзей, якія выехалі на далёкія сенакосы. Ім таксама даюцца канцэрты, прывозяцца новыя кінафільмы, дастаўляюцца свежыя газеты.

Я. ГАМОНКА.

Выстаўка твораў беларускіх мастакоў

У Полацкім гарадскім Доме культуры адкрыта перасоўная выстаўка лепшых твораў беларускіх мастакоў. На ёй прадстаўлена звыш 120 работ жывапісу і графікі.

Увагу гледачоў прыцягваюць работы мастака І. Ахрэмчыка — партрэт рэжысёра Міровіча і пейзаж «Ля сажалкі», карціны гомельскага мастака Звінагродскага «Прасторы ракі Сож», «Зіма» і інш. З цеплынёй паказвае савецкую дзетвару мастак Жалток. Яе карціны «Ля кастра» і «Зіма прышла» надоўга затрымліваюць ля сябе наведвальнікаў. Гэтай жа тэме прысвечаны работы мастакоў Кухарава «Калыханка» і Харытоненкі «Першая вясна».

Нямала карцін прысвечана жыццю калгаснай вёскі. Сярод іх найбольшую цікавасць выклікаюць такія творы, як «З працы» Ліўшыца, «Гарманіст ідзе» Дарашэвіча, «Аднаўленне зямлі» Геруса, «Рамонтныя работы ў МТС» Крохалева і інш. Суровую працу рыбакоў маляўніча перадаў мастак Забораў у карціне «Рыбакі возера Нарач».

На выстаўцы шырока прадстаўлены пейзажы роднай Беларусі. Добра глядзіцца работа мастака Каржанеўскага «На заходняй Дзвіне». Калгасная вёска ночу арыгінальна паказана ў карціне мастака Лі «Калгасныя агні». Сярод іншых работ выдзяляюцца карціны «Рака зімой» Дучыца, «Вясна» Давідовіча, «Дрэва Я. Купалы» Лейтмана, «На дачы» Радзялоўскай і іншыя. Змястоўна перадае багацці нашай рэспублікі карціна «Тарфяныя запасы» мастака Максімцава. Мастакі Давідовіч, Галоўчанка, Бельскі, Кудрэвіч і інш. дэманструюць партрэты вядомых людзей рэспублікі і пейзажныя мясціны Мінска.

Выстаўка твораў беларускіх мастакоў, якая ўпершыню арганізавана ў Полацку, карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод насельніцтва. Толькі за першыя некалькі дзён на выстаўцы пабывалі сотні палачан. У кнізе водгукаў яны дзеляцца сваімі ўражаннямі, пішуць аб тым, што ім больш за ўсё спадабалася і што б яны жадалі пабачыць у творчасці беларускіх мастакоў. Тут жа ёсць пажаданні, каб такія выстаўкі арганізоўваліся часцей.

Яўг. МАЦЮШЭНКА.

г. Полацк.

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай, дзіцячай і музычнай літаратуры:

В. Трапачынская-Агарак. Лясныя долы. Пераклад з польскай мовы Максіма Лужаніна. Прадмова Піліпа Пестрака. Мастак Е. Лось. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 424. Цана 14 руб. 45 кап.

Рабіндранат Тагор. Крушэнне. Раман. Пераклаў Сяргей Грахоўскі. Мастак Г. Клікушын. Тыраж 6 тыс. экз., стар. 272. Цана 6 руб. 30 кап.

Георгі Папоў. Паводка. Апавяданні на рускай мове. Мастак І. Някрасаў. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 272. Цана 3 руб. 50 кап.

Кастусь Кірэенка. Караблі. На рускай мове. Аўтарызаваны пераклад з беларускай мовы. Малюнкі А. Паслядовіч. Тыраж 16 тыс. экз., стар. 124. Цана 1 руб. 50 кап.

Васіль Вітка. Буслінае лета. Малюнкі В. Варанецкага. Тыраж 16 тыс. экз., стар. 56. Цана 3 руб.

М. Аладаў. Сімфан'ета. Партытура. На рускай мове. Тыраж 500 экз., стар. 144. Цана 30 руб. 50 кап.

Казімеж Брандыс. Грамадзяне. Раман. Пераклалі з польскай мовы Я. Міско і М. Татур. Мастак Г. Клікушын. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 564. Цана 18 руб. 65 кап.

А. Туранкоў. Песня бабыля Мікіты з оперы «Кветка шчасця». Для голасу з ф-на. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 4. Цана 55 кап.

Я. Цікоцкі. Песня Марфачкі з оперы «Дзяўчына з Палесся». Словы П. Броўкі. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 8. Цана 1 руб.

Р. Пукст. Рамансы. Для голасу з ф-на. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 128. Цана 17 руб. 20 кап.

Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі. Склаў Яўген Рапановіч. Мастак А. Сапетка. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 380. Цана 4 руб. 30 кап.

Моладзь на сцэне

Вядома, якіх вялікіх поспехаў дасягнула за апошнія гады савецкае мастацтва. І прыемна ўсведамляць, што ў гэтых поспехах многа працы нашай моладзі, яе перадавога атрада—Ленінскага камсамола.

З часу арганізацыі тэатра імя ЛКСМБ мінула амаль пятнаццаць год. Тэатр жыў і развіваўся, у яго былі перамогі і ён перажываў цяжкія часіны. І заўсёды вельмі неспрыяльна, ускладняючы гэтыя цяжкія часы, адбівалася і адбіваецца ў мастацкай практыцы акцёраў і асабліва маладых частая змена рэжысёраў.

У розныя перыяды дзейнасці тэатра прыходзілі рэжысёры розных школ і напрамкаў, рэжысёры-гастралёры, рэжысёры—эстэтствуючыя эксперыментатары, рэжысёры—рамеснікі-капіроўшчыкі. Многія з іх наносілі толькі шкоду маладому тэатру.

Нашаму тэатру, ды бадай і любому, неабходны рэжысёр-педагог. Акцёрская тэхніка ўдасканальваецца толькі ў вучобе і нясплынная практыцы. Але, на вялікі жаль, ні ў адным перыферыйным тэатры, уключаючы і наш, няма свабодных гадзін для вучобы. Дзень вельмі ўшчыльнены, а таму кіраўніцтва тэатра правільна робіць, смела вылучаючы моладзь на адказныя ролі, даючы гэтым магчымасць тэхналагічнага ўзбагачэння на практыцы. І гэта ўжо дало свае добрыя вынікі.

У нашым тэатры на працягу 14-ці год вырасла шмат маладых акцёраў, маючых магчымасць раскрыць свой талент. Артыстка Т. Аляксеева, якая працуе цяпер у тэатры імя Янкі Купалы, выступала ў сценах Брэсцкага тэатра. Не менш таленавіта раскрылі сябе артысткі Канавалава, Арыніна, Сонцава, Чакаліна і артысты Зверaў, Грачынскі, Канцадалаў, якія, нажаль, па розных прычынах цяпер не працуюць у Брэсцкім тэатры. А заслужаны артыст БССР Б. Уксусаў і артысты Ю. Уласаў, В. Лісоўскі, Л. Хрол — нядаўні маладняк — цяпер сталі моцна на ногі і сцаментаваліся з асноўным ядром тэатра.

Спіс акцёраў, якія ўжо выраслі з камсамольскага ўзросту, можна было б прадоўжыць, але прадстаячы агляд у гонар саракагоддзя ВЛКСМ—гэта экзамен на сталасць моладзі, якая не дасягнула 30-ці год, а ў нас такая ёсць. У першую чаргу хочацца адзначыць акцёра С. Яўдошанку, які чатыры гады назад скончыў Адэскае тэатральнае вучылішча і здолеў за свой яшчэ вельмі кароткі творчы шлях зрабіць пэўныя поспехі. І гэтыя поспехі Яўдошанкі не выпадковасць, а вынік вялікай працы, удумлівасці і самакрытычнасці.

Выпускніца Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Г. Маркіна, якая працуе ў тэатры другі год, у першых жа сваіх работах і асабліва ў ролях Жэнькі Шульжэнкі ў п'есе «Фабрычная дзяўчынка» Валодзіна і Ксені—малодшай дачкі капітана Бярсенева ў п'есе «Разлом» Б. Лаўрэнёва трывала заваявала сімпатыі гледача.

Артыстка Н. Ганчарэнка, якая прыйшла ў тэатр два гады назад са сцен Адэскага вучылішча, паспяхова выканала некалькі роляў. Цэлы рад створаных маладой артысткай вобразаў сведчаць аб таленце і ўменні працаваць над сабой.

Глыбокае пранікненне ў сутнасць ствараемага вобраза—характэрная рыса артысткі З. Зіноўевай. Яна цалкам апраўдвае выдатную школу пры Акадэмічным Малым тэатры, якую яна скончыла.

Ярка раскрыліся здольнасці артыста В. Віталіна ў ролях Пятра Каламійцава з «Апошніх» М. Горкага, Багдашкі-Скамароха ў казцы «Іван ды Мар'я» і ў студэнта Залаціна «Грач — птушка вясенняя». Сур'ёзную творчую заяўку зрабіў артыст Г. Хасьмінскі, які стварыў праўдзівы, задушэўны вобраз капітана Крупіна ў п'есе «Людзі, якіх я бачыў» С. Смірнова.

Скончыўшы ў 1957 годзе Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, камсамолец А. Зотаў вельмі добра паказаў сябе ў ролі Генадзія Лапшына ў п'есе «У пошуках радасці» В. Розава.

Упершыню творча пераканальна загучаў малады акцёр Г. Токараў, які іграе Алега «У пошуках радасці». У п'есе «Людзі, якіх я бачыў» артыст Бекіш у ролі польскага салдата Яна, не супакойваючыся, працуе над сабой, уносячы амаль у кожны спектакль усё больш і больш эмацыянальнасці, тэхнічнай дапрацоўкі і праўды.

Хочацца пажадаць маладым таварышам вялікай патрабавальнасці. У некаторых ад празмерных захвальванняў, што часта робяцца не ў меру нават кіраўнікамі і старэйшымі таварышамі, паяўляецца зазнайства, імкненне да прэм'ерства.

Патрэбна не толькі няспынное ўдасканаленне, уменне знаходзіць і выбіраць для сябе карыснае ў штодзённых рэпетыцыях, у якіх заняты сам, але і пастаяннае назіранне за работай іншых і асабліва старэйшых таварышаў. Гэта павінна спатарожнічаць кожнаму маладому акцёру. У нас, ды бадай і ў іншых тэатрах, вядзецца так: адрапетыраваў сваю сцэну і пайшоў, а калі зусім не заняты ў сённяшній рэпетыцыі, дык можна і зусім не прыходзіць у тэатр.

У некаторых склалася ілжывая думка, што скончыўшы інстытут, можна ўжо не вучыцца. А. Станіслаўскі гаварыў: «Калі ствараць спектакль прыйдуць людзі, якія ўмеюць працаваць над сваімі ролямі не толькі на рэпетыцыі, па ўказцы рэжысёра, але і дома па ўласнаму творчаму пачуццю і патрэбнасці вытанчанай псіхатэхнікі, тады тэмпы работы ўзмоцняцца самі па сабе ў шмат разоў».

Рыхтуючыся дастойна сустрэць знамянальную дату саракагоддзя камсамола, тэатр працуе над спектаклем па п'есе Ю. Прынцава «На вуліцы шчаслівай». Тэма будучага спектакля камсамол і партыя—адзіныя. На адказныя ролі прызначаны маладыя артысты; спектакль ставіць рэжысёр Я. Батурын, які яшчэ зусім нядаўна паказаў у новым спектаклі тэатра «Людзі, якіх я бачыў» С. Смірнова выдатнае рэжысёрскае майстэрства.

Мастак О. Бузаверaў, які афармляе спектакль «На вуліцы шчаслівай», ужо натхніў творчы калектыў сваёй задумай.

Спектакль «На вуліцы шчаслівай» з'явіцца дастойным падарункам радаснай гістарычнай даце 40-й гадавіны Савецкай Беларусі.

А. САМАРАЎ,
артыст тэатра імя ЛКСМБ.

Брэст.

Па купалаўскіх сцежках

Дзень добры, лясы, пералескі і горы!
Дзень добры, Радзімы любімая прасторы!
Дзе вершы складаў незабыўны Купала,
Па сцежках ягоных сягоння блукала.
З млыном гутарлівым я мела размову,
У шацёр па-над рэчкай зірнула альховы,
Да вербы пахілай над возерам даўнім
Схінуцца хацела у вечар жаданы.
Сівая бабулька прыхільна спытала:
— Напэўна сваяк быў вам Янка Купала?!
Напэўна... А як жа, хіба не сваяцтва,
Калі ні на момант мне з ім не расстацца...
Шукаю па пушчы ягоных слядоў,
Дзе йшоў ён да мэты «Шляхам гадоў...»
Шукаю курган, дзе зарыты гусляр,
Сардэчнае песні і струн уладар.
Ніхто не скуе нашых дум ланцугамі,
Бо мы гусляру выраслі сябрамі.
Зару на кургане я сэрцам спаткала.
Мой слаўны, мой любы, мой родны Купала!
І радасна сэрца ў грудзях замірала,
Бо поруч стаяў ужо Янка Купала.
Сяброўскай рукою паказваў мне сцежкі
І песцяў спагаднай бацькоўскай усмешкай.
У Акопах к зямельцы прыльнула я роднай,
І чула твой голас, мая Бандароўна.
І ты ж па крыві мне напэўна сваячка.
Напэўна?! Напэўна, яна не іначай...
Мой слаўны, любімы, мой родны Купала,
Я з грознаю хваляй ў вайну сябравала,
У бітвах, у моры народнага гневу
Нам роднае слова гучала напевам...
Шыпшыну прынесла табе з падарожжа,
Няхай яна сэрцы людскія трывожыць.
Няхай палымнее ў вяках тваё слова,
Каб грозная хваля ўзнялася нанова,
Калі хто пасмее, калі хто захоча,
Саюз наш парушыць сялян і рабочых...
Мой слаўны, любімы, мой родны Купала,
Цябе я сягоння ізноў прыгадала.
Даруй, калі слова якое не к месцу.
Ім, песням нясспетым, ў грудзях маіх цесна.
Каменныя пліты цябе не задушаць,
Хоць пэўна пад каменем цесна і душна...
У музейных пакоях спакой, адзінота,
І ты на радзіме бываеш ахвотна,
Жывы, пра жывое размову заводзіш,
На сцежку з гушчару лясного выходзіш
Да сонца і міру, да шчасця і згоды.
Такім ты астаўся жыць вечна ў народзе.

Зінаіда БАНДАРЫНА.

Апошні дыван

1

Днямі я натрапіў у гродзенскім універмагу на такі малюнак: ля прылаўка стаяла збянтэжаная пажылая цётка з кошыкам, вакол яе бушаваў натоўп жанчын. Я пацікавіўся ў чым справа.

— Гэта спекулянтка!—крыкнула адна.

— У міліцыю яе!—залямантавала другая, вырываючы ў цёткі кошык.

— Што вы, людцы добрыя?!—баранілася цётка.—Я не на продаж... Дачку замуж аддаю...

— Замуж!..—перадражніла яе жанчына.—З-за вас такіх вось тыпаў шпулечкі нітак не дакупішся, каб гузік дзіцяці ўшыць. І куды толькі міліцыя глядзіць.

Цяпер і я ўбачыў, што ў кошыку ляжала да сотні шпулек чорных і белых нітак саракавога нумара.

— У чым справа? Расступіцеся!—басавіта крычаў міліцыянер.—Грамадзянкі, пачакайце, гаварыце не ўсе адразу...

Я прыгледзеўся да перапалоханай цёткі. У яе быў выразны і крыху строгі твар. Вырашыў пацікавіцца, што прымусіла гэтую сталую і сур'ёзную жанчыну скупляць па гродзенскіх магазінах ніткі.

У гарадскім аддзяленні міліцыі жанчына расказала, што яна з вёскі Шэмбелеўцы Сапоцкінскага раёна, аддае замуж дачку і хоча ёй выткаць дыван.

— Апошні дыван!—вінавата апраўдвалася яна. — Далі-бог, больш ніколі ўжо не буду ткаць.

— А вы не бойцеся,—суцешыў яе дзяжурны. Міліцыянер перапрасіў жанчыну і адпусціў яе, пажадаўшы ёй шчасліва дачакацца ўнукаў.

2

Пазней я пабываў у Шэмбелеўцах, дзе жыве названая цётка. Адразу мне кінуліся там у вочы шпулькі. Нанізаўшы па некалькі дзесяткаў на вяровачкі, бегаюць з імі па вёсцы дзеці. Праз шыбы відаць, як на падваконніках стаяць на падстаўках са шпулек вазоны. У хатах на кожным цвіку, убітым вешаць адзенне, — шпулька. Шпулькі тут — адыход свайго роду «прамысловасці», якая існуе ў Шэмбелеўцах з тых дзён, з якіх існуе гэтая вёска.

Вялікую колькасць такіх шпулек сёння можна пабачыць не толькі ля Гродна ў Сапоцкінскім раёне. Яны сотнямі валяюцца ў вёсках Навагрудчыны, каля Ліды, ля Слоніма і Поразава, пад Ваўкавыскам.

Аказваецца і цяпер, як калісьці, у гродзенскай вёсцы існуе старадаўняе мастацтва—тканне дываноў. Існуе і нават развіваецца. І цяпер у нас ткуць дываны багатыя ўзорамі і фарбамі ды такія, што вачэй ад іх не адвядзеш. Гэтае мастацтва існуе цяпер, з той хіба толькі розніцай, што зараз яно нібы перайшло на нелегальнае становішча. Маркуйце самі. Каб выткаць адзін добры дыван, траба да двухсот шпулек нітак! А купіць гэтую колькасць і не быць западозраным у спекуляцыі, не так проста. Ды і гэта не ўсё. Шпулькавыя ніткі ідуць толькі на аснову. А на ўток ідуць шоўк ці шэрсць. І ўвосень, калі калгаснікі атрымліваюць разлік і маюць грошы, на Гродзеншчыну, як груганы, злятаюцца спекулянты. Яны бойка прапануюць:

— Ці не купіце маточак ядвабу? Зусім амаль дарма, сто рублёў за штуку...

— А мо' маточак шарсцяных нітачак возьмеце?..

І вось жанчыны, каб не забыцца свайго майстэрства, аддаюць нялёгка запрацаваныя свае сотні рублёў за гэтыя маточкі, якім сапраўдная цана па рублю за штуку. Потым некалькі дзён узапар, каб не выклікаць падазрэнняў міліцыі, яны ходзяць з магазіна ў магазін па Гродна, скупляюць па некалькі штук шпулек нітак на аснову. Тады гэтыя жанчыны яшчэ будуць з уласцівай толькі ім адным напорыстасцю ваяваць дома з мужыком, ставіць кросны, намотваць са шпулек ніткі на навоі, звязваць іх у адну доўгую, старанна перабіраць у ніты ды ткаць на кроснах, выбіраючы для гэтага вольную хвіліну. Напрыклад, у Шэмбелеўцах ткуць у 24 ніты і яшчэ на дошчачку. Складанасць гэтага спосабу зразумее толькі той, хто хоць крыху ў гэтым разбіраецца.

3

Над Нёманам у Гродна ад світання да вечара са здзіўляючай цярплівасцю стаяць з вудамі сотні рыбакоў. Не будзем спрачацца аб практычнай карысці гэтага занятку. Трэба сказаць, што гандлёвыя арганізацыі дбаюць пра рыбакоў і паляўнічых. Амаль у кожным горадзе вы знойдзеце спецыяльныя магазіны, дзе можна купіць усё: стрэльбу, спінінг, порах, кручок, паляўнічыя боты, рыбачую торбу. Для рыбакоў і паляўнічых працуе цэлая галіна прамысловасці. Становіцца дзіўным, чаму мы так крыўдзім нашых жанчын. Праўда, у апошні час з'явіліся ніткі «мулінэ» для вышывальшчыц. А вось для таго, каб выткаць дыван, матэрыялаў вы не знойдзеце ні ў адным магазіне, краме.

— Вось апошні дыван!—паказваюць экскурсаводы Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея экспанат за шклом у адным са сваіх шматлікіх залаў з экспазіцыямі.—Цяпер іх ужо не ткуць...

— Чаму?

— Лепей купіць у магазіне...—няўпэўнена тлумачаць у музеі.

А гэта няпраўда. Не можа фабрычны станок замяніць народнае ўмельства, як не заменіць фатаграфічны апарат рукі мастака! Уменне ткаць абрусы, дываны, паясы—гэта прыгожая галіна народнага мастацтва і яе нельга занядбаць.

4

У апошнія часы ў магазінах з'явілася шмат прадметаў хатняга ўжытку: паясоў, скрыначак, партманетаў, дываноў. Часамі яны робяцца пад народны стыль. Сярод іх ёсць некаторыя добрыя рэчы. Трапляюцца часамі і грубыя, аляпаватыя, неахайныя. Штампуе іх па стандарту, згодна з планам, адпаведную колькасць, якая-небудзь гарадская арцель, і гэтыя прадметы выдаюцца за прылаўкам за народныя. Што ж, пакупнік цяпер у нас багаты. У людзей ёсць поцыт на прыгожае. Вось яны і бяруць гэтыя прадметы. Але ці не лепш было б наладзіць вытворчасць сапраўды народных прадметаў там, дзе гэты від майстэрства яшчэ жыве?

На вёсцы многа дзяўчат. Праўда, гэта не такія ўжо дзяўчаты, як былі сорак год назад. Яны адукаваныя, з гадзіннікамі на руках, сядзяць ля радыёпрыёмнікаў і на пагулянкі ездзяць на веласіпедах. Але ж і кожная з іх, мабыць, марыць стаць гаспадыняй сям'і, стаць маці. І яны да гэтага рыхтуюцца. Адна справа пайсці ў сельмаг і купіць фабрычны дыван, другая—зрабіць яго сваімі рукамі. Апошні заўсёды будзе здавацца лепшым, як рыбаку здаецца смачнейшай рыба, злоўленая ім самім. Ды гэта і зразумела, у тканні праяўляецца душа народа, яго працавітасць, культура, нацыянальныя рысы.

Дапамагчы ткаллям у развіцці мастацкага ткацтва вельмі проста. Трэба арганізаваць выпуск нітак, узораў і фарбаў для вясковых жанчын. А няхай толькі з'явяцца ў сельмагах ніткі для ткання, жанчыны адразу знойдуць ім прымяненне. Тады можна будзе наладзіць конкурсы на лепшыя дываны, выдаваць спецыяльныя падручнікі, але гэта ўсё далей...

У нашу вёску прыйшла тэхніка. Жанчына цяпер стала больш вольнай. Свабодны свой час некаторыя жанчыны праводзяць часамі неразумна: ідуць у царкву або ў каспёл, ці святкуюць аж па тры дні сёмуху, і ўсё гэта таму, што няма сябе кудзі дзявацъ. Міністэрству культуры і Міністэрству гандлю варта ўсё ж падумаць і дапамагчы развіццю народнага промыслу, каб не чуваць было такіх слоў: «Апошні дыван».

А. КАРПЮК.

г. Гродна.

Канферэнцыя чытачоў

Днямі супрацоўнікі Крупскай раённай бібліятэкі правялі ў калгасе «Чырвоны Бобр» канферэнцыю чытачоў па раману «Калі зліваюцца рэкі» П. Броўкі. У абмеркаванні рамана прынялі ўдзел калгаснікі, настаўнікі мясцовай школы.

К. САНЬКО.

Філіял музея на станцыі Обаль

У памяць аб гераічных справах падпольнай камсамольскай арганізацыі «Юныя мсціўцы» на станцыі Обаль ствараецца філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

Для гэтай мэты адводзіцца пакой у сярэдняй школе, дзе вучыліся праслаўленыя камсамольцы. Тут будзе створана экспазіцыя аб іх жыцці і баявых справах.

Супрацоўнікі абласнога краязнаўчага музея ўжо сабралі многа матэрыялаў аб гэтай падпольнай групе. Сярод іх фатаграфіі сакратара Сіроцінскага падпольнага РК КПБ тав. Сіпко, камісара партызанскага атрада імя Варашылава Б. Маркіянава, сакратара Сіроцінскага РК камсамола Н. Германа, членаў падпольнай камсамольскай арганізацыі Герояў Савецкага Саюза З. Партновай і Е. Зяньковай, В. і Е. Езавітавых, сясцёр Лузгіных, Н. Азоліной, Н. Давыдава, В. Шашковай, Н. Дзяменцевай і іншых.

Сабраны дакументы пра Героя Савецкага Саюза Зінаіду Партнову — успаміны настаўніцы Татарэнкі, дзённік паспяховасці і пахвальная грамата, пісьмы гераіні да бацькоў, яе перапіска з Е. Зяньковай, грамата за ўдзел у гарадской алімпіядзе і інш.

Набыты асабістыя рэчы некаторых членаў падпольнай камсамольскай арганізацыі.

Экспазіцыя філіяла будзе адкрыта да 40-годдзя ВЛКСМ.

Гродзенскі тэатр на Украіне

З 30-га мая па 30-е чэрвеня ў Палтаве гастраляваў Гродзенскі драматычны тэатр. За гэты час паказаны 61 спектакль. Артысты выступалі перад працоўнымі калгасных палёў, рабочымі і служачымі заводаў і фабрык, інтэлігенцыяй горада.

Тэатр выязджаў у самыя аддаленыя раёны вобласці — Нехварашчанскі, Зяньковскі, Крамянчугскі. Дадзена 30 выязных спектакляў. Цёпла віталі артыстаў рабочыя і служачыя Крукаўскага вагонабудаўнічага завода, Крамянчугскай ГЭС.

Праведзены творчыя сустрэчы артыстаў з рабочымі паравозарамонтнага завода імя Жданава.

Тэатр з Палтавы выехаў на гастролі ў Херсон.

В. ВАРАНІЦКАЯ.

Палтава.

Інстытуцкі літаратурны альманах

У Брэсцкім педагагічным інстытуце імя А. С. Пушкіна выпушчаны трэці нумар літаратурна-мастацкага альманаха «Маладыя галасы». На старонках альманаха з новымі вершамі выступілі маладыя паэты І. Мельнічук, А. Саўчук, Ул. Хоміч і іншыя. Акрамя паэзіі, у альманаху шырока прадстаўлена і крытыка. В. Люкевіч у артыкуле «Лірыка П. Панчанкі» дзеліцца з чытачамі сваімі думкамі аб творчасці беларускага паэта. Цікавасць прадстаўляюць артыкулы Л. Шмакавай «Творчасць беларускіх партызан» і рэцэнзія А. Кушнярук на зборнік вершаў М. Танка «След бліскавіцы».

Альманах добра афармлены мастакам-студэнтам С. Іванцовым.

М. ШАВЕЛЬ.

—□—

По матэрыялах нашай газеты

„Людзі і пасады"

У артыкуле пад такім загалоўкам («Літаратура і мастацтва» ад 4 мая г. г.) ішла гаворка аб непаладках у рабоце культурна-асветных устаноў Віцебскай вобласці. Як паведамілі рэдакцыі з Віцебскага абласнога ўпраўлення культуры, факты, пададзеныя ў артыкуле, сапраўды мелі месца. Артыкул абмяркоўваўся на партыйным сходзе. Намечаны практычныя мерапрыемствы па ліквідацыі недахопаў, адзначаных у артыкуле і выяўленых на партыйным сходзе.

* * *

Чытач нашай газеты Ш. пісаў аб неабходнасці палепшыць культурна-масавую работу сярод рабочых саўгаса «Рогаўскі». Як паведаміў рэдакцыі сакратар Заслаўскага РК КПБ тав. Пыж, ліст абмяркоўваўся на семінары культасветработнікаў раёна. Прыняты меры па лепшаму абслугоўванню насельніцтва. У саўгасе «Рогаўскі» працуюць тры сельскія клубы, чатыры хаты-чытальні і сельскія бібліятэкі, два кінастацыянары і дзве кінаперасоўкі. У вёсцы Камянец пачата будаўніцтва новага клуба. Усе аддзяленні саўгаса неўзабаве будуць радыёфікаваны.

ВЕЧАРАМ У РАБОЧЫМ КЛУБЕ

Сюды, у прасторны светлы будынак, рабочыя, прыходзяць амаль што адразу пасля заканчэння змены. Прыходзяць людзі розных прафесій: зборшчыкі, інжынеры, слесары, аўтагеншчыкі, тэхнікі, служачыя, кіраўніцтва завода. І адразу ў клубе мінскіх аўтабудаўнікоў, становіцца весела, шумна.

У вызначаныя гадзіны тут пачынаюць працаваць драматычны, харавы, танцавальны гурткі, займаюцца салісты, мастацкая студыя, гурткі фотааматараў і духавых інструментаў. У глядзельнай зале дэманструюцца кінафільмы. Часта чытаюцца лекцыі на грамадска-палітычныя тэмы.

У мінулым годзе, напрыклад, да работнікаў клуба звярнуліся маладыя рабочыя. Яны расказалі, што вельмі любяць музыку і жадаюць часцей слухаць лекцыі на музычныя тэмы. Пажаданні рабочых былі ўлічаны. У хуткім часе быў створан універсітэт музычнай культуры. Стварыць яго культасветработнікам дапамаглі выкладчыкі Мінскай музычнай школы, кансерваторыі, Беллэяржэстрады.

Кожны вечар бывае вельмі ажыўлена ў клубе. Вось сталяр цэха рамонту жылля Уладзімір Трахановіч і зваршчык прэсавага цэха Аляксандр Бут-Гусаім (**здымак уверсе**). Яны не першы год ўдзельнічаюць у самадзейнасці. Цяпер развучваюць прыпеўкі, якія расказваюць пра жыццё аўтазаводцаў. Спевакоў суправаджаюць гітарыст і акардэаніст. Гэта інжынер Андрэй Матвеяў і культасветработнік Барыс Біхман.

У адным з пакояў клуба знаходзіцца фоталабараторыя. Многія рабочыя авалодалі не складанай, але цікавай справай фатаграфавання. Слесар Ю. Грэдзін і слесар-зборшчык Ларыса Людчык не толькі робяць здымкі для саміх сябе, але і з'яўляюцца фотакарэспандэнтамі насценнай заводскай газеты. Гэтым вечарам яны займаліся любімай справай: рабілі адбіткі новых здымкаў (**здымак другі**).

У гэты ж вечар у госці да аўтазаводцаў прыехаў калектыў Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага. На сцэне клуба быў паказаны спектакль «Кароль Лір».

Калі ж апусцілася заслона — за кулісы да артыстаў прышлі ўдзельнікі драматычнага гуртка. Народныя артысты БССР А. Кістаў і А. Абуховіч яшчэ не паспелі зняць парыкі, касцюмы і грым, як прышлося адказваць на шматлікія пытанні самадзейных артыстаў. Іх цікавіць, як працаваў А. Кістаў над роллю караля Ліра, як трэба вывучваць ролі, як накладваць грым. Майстры сцэны ахвотна адказвалі на пытанні. (**Здымак унізе справа**).

А на здымку злева — заняткі харавога гуртка. Удзельнікі гуртка развучваюць новыя песні. Гэта — творы беларускіх і рускіх кампазітараў, песні народаў СССР.

Тэкст **М. Лагуціна.**
Фота **С. Васільніцкага.**

Кінамастацтва Савецкай Латвіі

За апошні час кінамастацтва Савецкай Латвіі зрабіла вялікі крок наперад. Карціны, выпушчаныя Рыжскай студыяй мастацкіх і дакументальных фільмаў, з поспехам дэманструюцца ў братніх рэспубліках.

Кінафільм «Райніс», пастаўлены рэжысёрам Ю. Райзманам па сцэнарыю Ф. Рокпельніса і В. Крэпса, расказвае пра творчасць і грамадскую дзейнасць выдатнага паэта Латвіі. У яркіх мастацкіх вобразах фільм сцвярджае ўрачыстасць прагрэсіўных ідэй, расказвае пра мары латышскага народа.

Карціна «Да новага берага» з'яўляецца экранізацыяй рамана аднаго з буйнейшых пісьменнікаў Латвіі В. Лаціса.

Радасным было паяўленне яркага нацыянальнага фільма «Веснавыя замаразкі». Характэрнай тэмай для творчасці Рудольфа Блаумана была тэма загубленай маладосці і прададзенага шчасця. Пісьменнік маляваў у сваіх навелах цяжкую народную долю, паказваў несправядлівасць сацыяльных адносін.

На аснове раду навел Р. Блаумана аўтары сцэнарыя Ю. Ванаг і С. Нагорны здолелі стварыць выразнае нацыянальнае драматычнае апавяданне. У фільме гаворка ідзе аб самым дарагім для чалавека — аб каханні, аб праўдзе пачуццяў. Разам з тым—гэта суровая аповесць пра ўмовы жыцця, якія прымушалі людзей здраджваць гэтай праўдзе. У фільме ярка паказана, як юная Мадра прынесла ў ахвяру каханне ў імя матэрыяльнай забяспечанасці. І яна жорстка расплацілася за гэта. Спачатку дзяўчына поўнілася маладосцю, прыгажосцю і шчасцем, а потым, стаўшы гаспадыняй хутара «Мальніекі», яна ператвараецца ў жорсткую і скупую, як і яе нялюбы муж Мігла. У вобразах бедных сваякоў Мадры паказана жыццё тых, хто не валодае хутарамі, пазбаўляецца самых маленькіх участкаў зямлі. «Веснавыя замаразкі»—творчая перамога кінамастацтва Латвіі.

Не так даўно ў Латвіі і ў іншых рэспубліках дэманструецца мастацкі фільм «За лебядзіной чарадою воблакаў».

Падзеі, якія адлюстраваны ў фільме, адносяцца да апошніх дзесяцігоддзяў мінулага стагоддзя. Героі фільма Марцін—сын лясніка з ваколіцы Вентспілса і дачка мясцовага настаўніка Дацэ. На фоне гістарычных падзей нараджаецца іх каханне. Маладыя людзі актыўна ўключаюцца ў барацьбу рабочых і прагрэсіўнай інтэлігенцыі за свабоду. Марцін—гімназіст, партовы рабочы, салдат, бунтаўшчык... Вернай яму застаецца яго сяброўка маленства Дацэ, якая перад высылкай Марціна на катаргу, вінчаецца з ім у турэмнай капцылярыі.

Зусім нядаўна Рыжская кінастудыя выпусціла яшчэ адзін фільм «Нурыс».

Побач з выпускам нацыянальных фільмаў Рыжская студыя сістэматычна дубліруе на латышскую мову лепшыя савецкія кінакарціны. На латышскую мову былі, напрыклад, дубліраваны і пушчаны на экран фільмы «Сёстры», «Ціхі Дон» (першая і другая серыя), «Камуніст» і іншыя.

Рыжскія кінематаграфісты зрабілі здымкі дакументальных кінанарысаў пра лепшыя калгасы рэспублікі, аб Прыбалтыйскім фестывалі савецкай музыкі, аб міжнародным мотакросе. Апроч таго, выпушчана 500 нумароў кіначасопіса «Савецкая Латвія».

Цяпер калектыў Рыжскай кінастудыі вядзе здымкі новага мастацкага фільма «Латышскія стралкі» і рыхтуе да вытворчасці фільм «Чужая ў пасёлку».

Н. ДАРОНІН.

Мікалай АРХІПАЎ

Да сустрэчы

Мікалай Архіпаў у якасці ваеннага журналіста доўгі час знаходзіўся ў Польскай Народнай Рэспубліцы. Ён напісаў аповесць «Галя», прысвечаную сённешнім падзеям у Народнай Польшчы, дружбе савецкага і польскага народаў. Галоўныя героі аповесці — простая польская вясковая дзяўчына Галя Ляшчынская і афіцэр Савецкай Арміі Анатоль Новікаў. Яны сустрэліся і шчыра пакахалі адзін аднаго. Бацька Галі, у якога яшчэ жывуць рэшткі старога мінулага, дробнаўласніцкага, — супраць іх дружбы. Але жыццё паказвае, што перамагае новае, перамагае дружба і каханне.

Друкуем урывак з аповесці М. Архіпава.

На другі дзень пасля размовы з Галяй Анатоль Новікаў не мог дачакацца, пакуль надыйдзе вечар. Як толькі ён вызваліўся ад службы, адразу ж пайшоў у пасёлак, у якім жыве Галя з бацькам. У вушах у яго, як нейкая асаблівая кранаючая музыка, гучалі галіны словы, якія яна сказала на развітанне: «Буду чакаць вас заўтра».

Калі Галя адчыніла дзверы, Новікаў адразу заўважыў, што вочы дзяўчыны сумныя, заплаканыя. Позірк гэтых вачэй, у якіх мільганула штосьці бездапаможнае і жаласнае, нібы гаварыў яму: «Я пра ўсё расказала бацьку. Ён незадаволены і хоча гаварыць з вамі».

Адчуваючы штосьці нядобрае, Новікаў увайшоў у дом. Галя зрабіла некалькі крокаў за ім і спынілася каля расчыненых дзвярэй. Уважлівы позірк яе спыніўся цяпер на бацьку, які зусім не заўважаючы госця, хадзіў па пакоі.

— Добры дзень, пане Ляшчынскі! — ветліва павітаўся Новікаў.

Гаспадар крута павярнуўся, нібы спалоханы, потым акінуў госця праніклівым позіркам з ног да галавы.

— Сядайце, калі ласка, малады чалавек, — запрасіў ён.

Польскі настаўнік Ляшчынскі, як і яго дачка, добра гаварыў па-руску. Гэта можна было заўважыць з першых слоў.

— Ты, Галя, займіся сваёй справай, — звярнуўся ён да дачкі. — У нас тут будзе свая размова.

Новікаў сеў. Але Галя як стаяла, так і засталася стаяць, нават не крануўшыся з месца, нібы зусім не чула слоў бацькі. «Ці ж мне нельга ведаць, тата, пра што вы будзеце гаварыць? — казалі яе вочы. — Я ж ведаю, пра што вы хочаце весці размову».

— Пакінь нас, — ужо неяк раздражнёна сказаў Ляшчынскі. — Ідзі!

Пунсовыя, крыху ўспухлыя галіны губы ледзь не затрэсліся ад злосці. Словы пярэчання гатовы былі сарваца з іх, але, убачыўшы нахмураныя бровы бацькі, Галя стрымалася, здзіўлена паціснула плячыма і выйшла.

— Дачка нічога не хавае ад мяне, — пачаў Ляшчынскі, калі зачыніліся дзверы,— мне вядома пра вашу ўчарашнюю размову. Я лічу што і вы, і яна памыляецеся.

— Я не памыляюся, — хацеў растлумачыць Новікаў.

— Выслухайце мяне, — спыніў яго Ляшчынскі.—Галя вас амаль не ведае, а з такім пачуццём, як каханне, не жартуюць.

— Але ж я не вінаваты, што не сустракаў раней вашу дачку. Я раскажу пра сябе. Мае бацькі жывуць у Смаленску, працуюць на заводзе. Хочаце, я пакажу вам іх лісты?

— Не трэба, — нездаволена адказаў Ляшчынскі.

Відаць было, што ўсхваляваныя словы Новікава выклікалі ў яго не абыякавае ўражанне. Ужо неяк мякчэй і спакайней ён паглядзеў на субяседніка.

— Вы яшчэ маладыя і пра многае мяркуеце, не задумваючыся. У Галі таксама вецер гуляе ў галаве. Вам вядома, што ёй трэба вучыцца? Вы падумалі пра тое, што я адзінокі чалавек і не згаджуся ні ў якім разе развітацца з дачкой?

— Не падумаў, — шчыра пацвердзіў Новікаў. — Але пра гэта яшчэ рана думаць.

— А я падумаў. З дачкі маёй ужо смяюцца ў пасёлку...

— Чаму? Што мы зрабілі дрэннага?

— Я ж не абвінавачваю вас, але я не дазволю, каб пра маю дачку плёткі распускалі.

Новікава гэта яшчэ больш усхвалявала. Ён ускочыў і зрабіў некалькі крокаў да дзвярэй, але раптам спыніўся.

— Я здзіўлены вашымі словамі. Хто смяецца, якія плёткі?

— Людзі гаварыць, што вы зачасцілі да нас. А гэта нядобра.

— Ну што ж, калі вы гэтага хочаце, не буду заходзіць больш.

Ляшчынскі памаўчаў, нібы шукаючы словы для адказу, раптам цвёрда і катэгарычна заявіў:

— Вось так будзе лепей. Не прыходзьце зусім.

— Не, усё ж не, — не згаджаўся ўжо з самім сабой Новікаў. — Я не магу адзін вырашаць за двух. А Галя!? Вы цікавіліся, як яна на гэта глядзіць?

Твар Ляшчынскага спахмурнеў. Ён цяжка ўздыхнуў, сказаўшы толькі адно слова «шкада», і забарабаніў пальцамі па стале.

— Вельмі шкада, што мы не дамовіліся, — паўтарыў ён праз некаторы момант. — Не хацелася крыўдзіць вас, але я настойваю. Не прыязджайце больш.

— Я запытаю ў Галі,—нібы сам сабе сказаў Новікаў.

Ляшчынскі ўстаў першым. Яны выйшлі ў пярэдні пакой. Насустрач з'явілася Галя. Сумны позірк афіцэра і насупленыя бровы гаспадара дома пацвярджалі, што размова, якая адбылася паміж імі, мела вельмі мала прыемнага.

— Чым вы, тата, пакрыўдзілі нашага госця? — імкнулася Галя ўсміхнуцца і развесяліць сваёй усмешкай мужчын, ператварыць усё ў жарт, але з гэтага нічога не атрымалася. І яна, заўважыўшы, што бацька мае сур'ёзны намер выправадзіць Новікава з дому, кінула на старога востры, дапытлівы позірк.

— Вы забаранілі яму заходзіць да нас? Так?

Не чакаючы адказу, яна выбегла з хаты на ганак і паклікала за сабой Новікава.

— Я праводжу вас, Анатоль Пятровіч,— сказала яна афіцэру, калі за імі з грукатам зачынілася брамка.

На вузенькіх вуліцах пасёлка не было ні душы. Дождж, які ішоў ужо некалькі гадзін не перастаючы, загнаў усіх у ціхія, цёплыя хаты. Новікаў адчуваў сябе неяк няёмка. У ім то ўспыхвала кранаючая за самае сэрца чалавечая гордасць, то разгаралася крыўда на Ляшчынскага, то з'яўлялася раптам пачуццё нейкага асабліва вострага жалю да дзяўчыны. Галя хутка крочыла побач і думала пра нешта сваё. Паглядваючы на Анатоля, яна ўсміхалася яму, але на душы было цяжка. Ёй хацелася плакаць. Яна стрымлівала слёзы, не падаючы віду, што на сэрцы ў яе такі цяжар.

— Вось тут, — сказала яна спыніўшыся, калі прайшлі ўжо з паўкіламетра за пасёлак. Мокрыя дрэвы шумна шалясцелі лісцем. Усё неба засланілі хмары. Зрэдку налятаў парыўны вецер і тады з дрэў сыпаліся на адзенне буйныя кроплі. — Вось тут я буду чакаць вас. — паўтарыла Галя ўсміхнуўшыся праз слёзы. — Прыходзьце...— Яна хацела яшчэ штосьці сказаць, але Новікаў раптам прытуліў яе да сябе і яна на момант даверліва, ласкава таксама прытулілася да яго.

— Да спаткання, Галя. Бывай... Я прыду зноў паслязаўтра, — сказаў Анатоль, яшчэ раз абняўшы дзяўчыну на развітанне.

Але сустрэча не адбылася.

Раніцой Новікаў даведаўся, што яго накіроўваюць у доўгатэрміновую камандыроўку.

Загад быў такім нечаканым, што Новікаў нават разгубіўся. Як жа так? Паехаць, не пабачыўшы Галі? Дамовіліся ж сустрэцца. Што яна падумае?

Думка пра тое, што надоўга давядзецца развітацца з любай дзяўчынай, усё больш і больш трывожыла афіцэра. Ці ж мала што можа здарыцца за гэты тэрмін? Упарты і суровы бацька будзе ўвесь гэты час даказваць дачцы, што ён, Новікаў, не пара для яе. А там закончацца канікулы. Пачнуцца заняткі ва ўніверсітэце. Там яе сябра Казімір. Магчыма, паміж імі не проста дружба!

Новікаў разумеў, што нельга ехаць, не папярэдзіўшы Галю, не развітаўшыся з ёй. Але спаткацца ў дамоўлены час ужо немагчыма. І сёння ўвечары ён будзе заняты на службе: камандзір склікае нараду. І ён вырашыў неадкладна, у час абедзеннага перапынку, з'ездзіць на матацыкле ў пасёлак хоць на адну хвіліну да Галі.

Пасёлак сустрэў яго мёртвай цішынёй. Усе людзі былі ў полі, працавалі на кааператыўнай гаспадарцы. Каля знаёмай брамкі Новікаў сустрэўся з Казімірам. Студэнт адказаў кіўком галавы на прывітанне і, не спыніўшыся, пакрочыў па бязлюднай вуліцы.

Галі не было дома. Яна таксама працавала ў полі. І Новікаў толькі паспеў папрасіць Ляшчынскага, каб той перадаў Галі паперку, на якой напісаў:

«Галя! Заўтра еду ў камандзіроўку. Вельмі шкада, што не застаў вас. Бывайце. Да сустрэчы. А. Новікаў».

Ляшчынскі моўчкі ўзяў паперку і абяцаў перадаць яе дачцы.

Позна ўвечары Галя вярнулася з поля. Хутка прабегшы напісаныя алоўкам радкі, яна адмовілася нават ад вячэры, накінула на галаву хустку і кінулася бегчы з хаты.

— Куды ты насупраць ночы бяжыш? — нездаволена кінуў ёй услед бацька. — Пачакай, ён сам прыдзе...

— Не хвалюйся, я хутка вярнуся, — крыкнула Галя і яшчэ хутчэй пабегла ў бок маладога ляска, які сінеў у вячэрнім змроку зусім блізка. Ляшчынскі выцягнуў з кішэні камізэлькі гадзіннік і паклаў перад сабою на стол. Прайшла гадзіна, другая. Галі не было.

Лаючы сябе за тое, што дазволіў дачцы пайсці вечарам з дому, настаўнік апрануўся і выйшаў на вуліцу. Па дарозе да ляска ён не ўбачыў ніводнага чалавека, не пачуў ніводнага гуку. Усе людзі пасёлка ўжо спалі.

— Галя! Галя!—крычаў стары, углядаючыся ў густы змрок.—Дзе ты? —і толькі рэха адказвала працягла: — ы-ы-ы.

Ён пастаяў моўчкі хвіліну, другую, і раптам аж уздрыгнуў ад думкі, што Галя пайшла да Новікава ў гарадок, у якім той жыве. Разгневаны, ён вярнуўся ў пасёлак і пастукаў у вакно першага дома. — Прошу пана! — крычаў ён, — Выходзьце хутчэй на вуліцу, дапамажыце мне!

Не адказваючы на пытанні людзей, якія ўскоквалі з ложкаў і глядзелі на яго з вокан, ён бег ужо да другога дома і таксама стукаў у акно і зноў прасіў выходзіць хутчэй на вуліцу і дапамагчы яму.

Хутка амаль увесь пасёлак быў на нагах. Загрукаталі каліткі, пачуліся розныя галасы. Хтосьці бег насустрач з ліхтаром. Ляшчынскі спыняў людзей, хапаў іх за рукі, крычаў: «Рускі падпаручык увёз Галю, трэба дагнаць іх».

З адказаў, якія Ляшчынскі ў хваляванні даваў на пытанні акружыўшых яго жыхароў, яны зразумелі, што дзяўчына пайшла ў лясок, каб сустрэць там савецкага афіцэра. Некаторыя проста пасмяяліся са старога, які ўзяў уначы трывогу, пайшлі працягваць свой адпачынак, а другія ўсё яшчэ стаялі каля Ляшчынскага і даказвалі яму, што нічога не здарыцца, усё будзе добра; нічога дзіўнага няма ў тым, што польская дзяўчына пакахала савецкага афіцэра.

Ляшчынскі ўсё ніяк не мог супакоіцца. Ён папрасіў кагосьці збегаць да яго дамоў, паглядзець, ці не вярнулася дачка, як раптам каля самай дарогі вырысавалася постаць. Гэта была Галя.

... Як ёй не хапала зараз Новікава. Чаму ён пакінуў яе адну ў такі цяжкі для яе час?

У Галі нараджалася ўсё большае і большае жаданне хоць бы яшчэ раз убачыць яго, пагаварыць з ім.

Чаму ж ён, родны бацька, супраць іхняга кахання? Каханне! Яно не ведае ні межаў, ні граніц, калі яно такое чыстае, такое гарачае, што без яго нельга пражыць ні дня.

Галя не пераставала ні на хвіліну чакаць Новікава і верыла, што ён вернецца. У гэты вечар яна яшчэ раз выходзіла да брамкі і доўга стаяла з надзеяй, што вось-вось пачуе знаёмыя крокі.

Грунтоўнае даследаванне

Мікалай Астроўскі — адзін з выдатнейшых савецкіх пісьменнікаў. Яго кніга «Як гартавалася сталь», якая раскрывае цудоўны вобраз новага чалавека, народжанага бурай, увайшла ў залаты фонд савецкай літаратуры.

Творы Астроўскага шырока вядомыя і за рубяжом. Мільёны чытачоў у краінах сацыялістычнага лагера і ў капіталістычным свеце адчулі на сабе жыватворчы ўплыў гэтай светлай, гераічнай і жыццярадаснай кнігі.

З вялікім задавальненнем сустракае наш чытач кожнае новае даследаванне аб жыцці і творчасці М. Астроўскага. Значную цікавасць уяўляе і кніга Э. Гурэвіч «Творчая гісторыя раманаў Мікалая Астроўскага», якая выйшла ў 1957 г. у выданні Акадэміі навук БССР. Гэта па сутнасці першае грунтоўнае даследаванне аб творчасці Астроўскага ў беларускім літаратуразнаўстве. Гэта адначасова і першая спроба вывучэння творчай гісторыі раманаў М. Астроўскага ў савецкім літаратуразнаўстве наогул.

Да матэрыялаў рукапісаў, да вывучэння розных рэдакцый раманаў пісьменніка звярталіся даследчыкі Н. Венгераў і С. Трэгуб. Але яны выкарысталі гэтыя матэрыялы ў сваіх кнігах часткова, выбарачна, наколькі гэта было неабходна ў ідэйна-мастацкім аналізе твора.

Грунтоўнага разгляду розных рэдакцый рамана «Як гартавалася сталь», параўнальнага аналізу гэтых варыянтаў з мэтай вывучэння працэсу стварэння вобразаў пісьменнікам, да выхаду ў свет кнігі Э. Гурэвіч не было. Праўда, у друку з'яўляліся паасобныя часопісныя артыкулы сакратароў Астроўскага, якія часткова раскрывалі творчую гісторыю раманаў пісьменніка. Але гэтыя матэрыялы насілі не столькі навуковы, колькі дакументальны характар.

Вялікай вартасцю кнігі «Творчая гісторыя раманаў Мікалая Астроўскага» з'яўляецца тое, што яна менш за ўсё падобна на сухую акадэмічную працу бясстраснага апісальніка рукапісных матэрыялаў. Наадварот, кніга напісана рукой даследчыка, які раскрыў жывую творчую лабараторыю пісьменніка і з хваляваннем расказаў пра гэта.

Хоць у агульнай задуме работы першы раздзел кнігі адыгрывае па сутнасці службовую ролю і не прэтэндуе на якія-небудзь адкрыцці ў галіне вывучэння творчасці М. Астроўскага, але тым не менш ён мае паўную цікавасць. У ім даецца кароткі, спіслы, насычаны фактычным матэрыялам літаратурна-крытычны нарыс аб рамане «Як гартавалася сталь».

Найбольшую цікавасць уяўляе раздзел аб творчай гісторыі рамана «Як гартавалася сталь». Тут сабраны факты, якія сведчаць аб вялікім таленце пісьменніка, аб яго выключнай працаздольнасці і патрабавальнасці да слова. Мы даведваемся, што Астроўскі прачытвае мноства кніг, якія пашыраюць яго агульны і літаратурны кругагляд, як ён авалодвае майстэрствам мастака і стварае свой першы раман, і ўсё гэта ў выключна кароткі тэрмін, і ўсё гэта амаль выключна сілай уяўлення і памяці, не маючы магчымасці апрацоўваць свае думкі на паперы.

Разам з гэтым даследчык паведамляе цікавыя дэталі, якія ярка характарызуюць творчы працэс М. Астроўскага.

Валодаючы вострым крытычным пачуццём у адносінах уласных літаратурных твораў, якое ўласціва вялікім мастакам, Астроўскі да апошніх дзён свайго жыцця працаваў над удасканаленнем рамана «Як гартавалася сталь». Э. Гурэвіч разглядае пяць рэдакцый рамана. Пісьменнік карыстаецца кожным новым выданнем твора, уносячы часта істотныя змены ў паасобныя вобразы і сцэны, паглыбляючы і ўдасканальваючы іх ідэйна-мастацкае гучанне. Даследчык дае параўнальную характарыстыку ўсіх пяці рэдакцый і ўстанаўлівае, што найбольш істотныя папраўкі пісьменнік унёс у трэцяе рускае масавае выданне рамана ў 1935 г, калі работа над новым творам «Народжаныя бурай» значна пашырыла рамкі.

Доўгі час, аж да з'яўлення кнігі Н. Венгерава, усе савецкія даследчыкі памылкова атоесамлівалі раман «Як гартавалася сталь» з біяграфіяй пісьменніка, а вобраз Паўла Карчагіна — з Мікалаем Астроўскім. Шляхам простага супастаўлення падзей і вобразаў рамана з дакладнымі фактамі біяграфіі пісьменніка, а таксама шляхам паглыбленага аналізу вобразаў твора Н. Венгераў дажазаў памылковасць і заганнасць гэтага пункту погляду, які прыніжае мастацкую сілу і значэнне рамана «Як гартавалася сталь».

Матэрыялы даследавання Э. Гурэвіч пацвярджаюць гэтае палажэнне Венгерава новымі пераканальнымі фактамі. У кнізе мы знойдзем цікавы матэрыял, які сведчыць, што вобраз Паўла Карчагіна ствараўся як абагулены мастацкі вобраз, а не злепак з адной асобы.

Мы бачым, як Астроўскі шляхам творчых пошукаў вызначае тыповыя рысы жыцця і паводзін свайго героя. Так, спачатку ў рукапісу, як паведамляе даследчыца, Паўка ў дзіцячыя гады быў паказаны веруючым. У далейшай рабоце пісьменнік здымае гэтую рысу ў вобразе героя, відаць, адчуўшы, што яна не можа быць уласцівай актыўнай натуры і жывому крытычнаму розуму хлопчыка. Далей у рукапісу мы сустракаем эпізод звязаны з часовым адрывам героя ад партыі. Павел спачатку не зразумеў палітыкі партыі ў гады нэпа, у выніку чаго папаў у лагер «рабочай апазіцыі». І толькі праз некаторы час, глыбока ўсвядоміўшы сваю памылку і раскаяўшыся, герой зноў вяртаецца ў рады партыі. У далейшай рабоце над раманам Астроўскі здымае гэты эпізод, лічачы, што такая памылка Паўла Карчагіна збядніць, знізіць увесь яго вобраз, і што яна не тыповая для сапраўднага маладога рэвалюцыянера нашай эпохі. Пісьменнік здымае ў вобразе Карчагіна і рысы прадмернага рэвалюцыйнага аскетызма, асабліва выдзеленыя ў рукапісным варыянце. На падставе гэтага і іншага матэрыялу даследчыца робіць справядлівае заключэнне аб тым, што Астроўскі ствараў вобраз галоўнага героя рамана не па свайму падабенству, а ў адпаведнасці з эстэтычным ідэалам, народжаным рэвалюцыйнай эпохай, у якую ён жыў.

На падставе прыведзеных архіўных матэрыялаў мы можам прасачыць і работу пісьменніка над вобразам Жухрая. Гэтая работа зводзілася да таго, каб падняць Жухрая да вобраза камуніста-арганізатара, вобраза, які прадстаўляе ў рамане магутную арганізатарскую і натхняючую сілу партыі.

Мы бачым, як пісьменнік працуе над паглыбленнем гістарызма падзей, адлюстраваных у рамане. У выданні 1935 г. Астроўскі значна больш поўна і шырока паказвае размах рэвалюцыйнай барацьбы ў Шапятоўцы і акружаючых раёнах, падкрэслівае яе інтэрнацыянальны характар. У рэвалюцыйнай барацьбе актыўны ўдзел прымаюць не толькі ўкраінцы і яўрэі, але і палякі. Пісьменнік уводзіць новыя вобразы: паляка, рабочага лесапільнага завода Антэка Клапатоўскага, смелага польскага рэвалюцыянера Снягурку, значна пашырае характарыстыку дзейнасці камісара Тыжыцкага.

У кнізе прыведзены вялікі матэрыял, які характарызуе старанную работу пісьменніка над стылем рамана па выкараненню празмернага меладраматызму, расцягнутасці ў гістарычных экскурсах, халоднай рыторыкі і натуралізма ў мове. На 150 старонцы наглядна паказана, як ад адной рэдакцыі да другой мова твора ачышчалася ад празмерных дыялектызмаў, вульгарызмаў і г. д.

Нажаль, небагаты матэрыяламі трэці раздзел. У ім раскрываецца работа Астроўскага над раманам «Народжаныя бурай». Даследчыца прасочвае, як на аснове глыбокага вывучэння гістарычных матэрыялаў, Астроўскі з тонкім палітычным чуццём стварае выразна акрэсленыя вобразы, якія выкрываюць прадстаўнікоў антынароднага контрэвалюцыйнага лагера: Эдварда Магельніцкага, Іераніма, Пятлюры і інш.

Увогуле ўся работа Э. Гурэвіч дае магчымасць прасачыць працэс росту майстэрства пісьменніка, убачыць сваімі вачыма, як нараджаўся такі дарагі і любімы намі пісьменніцкі стыль М. Астроўскага, які вызначаецца лаканізмам, энергіяй і вялікай усхваляванасцю.

Слабы бок кнігі Э. Гурэвіч — паўная рыхласць кампазіцыі. Можа выклікаць пярэчанне размяшчэнне матэрыялу па асобных раздзелах. Так, напрыклад, на наш погляд, не да месца прыводзіць матэрыял, які паказвае работу аўтара над вобразам Арцёма, у першым раздзеле даследавання, таму што гэтае пытанне шырока разбіраецца ў другім раздзеле. Іншы раз, праўда, даволі рэдка, але можна папракнуць даследчыцу ў празмернай абстрактнасці і туманнасці думкі.

Кніга Э. Гурэвіч «Творчая гісторыя раманаў Мікалая Астроўскага» — цікавае і грунтоўнае даследаванне, якое з прыхільнасцю сустрэне наш чытач.

Е. ЛЕНСУ.

У рэпертуар мастацкай самадзейнасці

Песня беларускіх дзяўчат

Музыка І. КУЗНЯЦОВА *Словы А. АСТАПЕНКІ.*

Запяем, падружанькі, запяем,
Як працуем шчасліва, як жывем,
Як заўсёды сонейка з вышыні
Асвятляе радасцю нашы дні.

Гэта вось Кастрычніка слаўны час
Вывеў на дарожачку з цемры нас:
Зналі толькі печку мы ды парог,
А цяпер—прывольныя сто дарог.

Не ад ветру буйнага стогне бор,
То ўзляцела лётчыца вышай гор,
То дзяўчына жвавая ды з касой
Правяла палеткамі трактар свой.

Даў нам фарбы новыя новы свет,
Вышываем Леніна мы партрэт,
Вышываем светлую з мар кайму,
У справах нашых вечна жыць яму.



Рэспубліканскі Дом народнай творчасці РЭКАМЕНДУЕ:

ТВОРЫ ДЛЯ ЧЫТАЛЬНІКАЎ

Корбан Ул. Размова ў цягніку. (У зборніку: «Мастацкае слова» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1952 г.) Сустрэча вясны. Таленты. Генерал. Пісака, байкі. (У кнізе: У. Корбан «З вецярком» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.). Якубаў вопыт. (У часопісе «Вожык» № 12, 1957 г.). Няўдзячныя. (У часопісе «Вожык» № 14, 1957 г.). Сябры і ворагі (У часопісе «Вожык» № 22, 1957 г.).

Крапіва К. Дыпламаваны баран, Махальнік Іваноў. Сава, асёл ды сонца. Жаба ў каляіне. (Любое выданне).

Кулакоўскі А. Расстаемся ненадоўга, раман, урывак на выбар. (Дзяржвыдавецтва БССР, 1956 г.).

Куляшоў А. Чараўніца. Камсамольскі білет. (У кнізе: А. Куляшоў «Выбраныя творы» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1951 г.). Спяваючы гімн камуністаў. Кожны мае свой бор... Камуністы. Жывы Ленін. (У кнізе: А. Куляшоў «Збор твораў» т. I — Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.). Толькі ўперад, паэма, урывак на выбар. (У кнізе: А. Куляшоў «Збор твораў» т. II. — Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.).

Караткевіч У. Спадарожніку зямлі. (У часопісе «Полымя» № 12, 1957 г.).

Карнееў Я. Пачатак дружбы. (У часопісе «Маладосць» № 4, 1956 г.).

Лужанін М. Расказ брыгадзіра. Сёстры. (У кнізе: М. Лужанін «Поступ» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1950 г.).

Лынькоў М. Андрэй Лятун (апавяданне, урывак на выбар). Дзед Аўсей і Палашка. Астап. (У кнізе: М. Лынькоў «Выбраныя апавяданні» —Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.). Векапомныя дні (раман, урывак на выбар з частак 1, 2, 3, 7, 8, 9. (У часопісе «Полымя № 7—12, 1957 г.).

Лупсякоў М. Букет ружаў. Паядынак. Першае каханне. Званары. (У кнізе: М. Лупсякоў «Паядынак»—Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.).

Машара М. Гастэлу. Дарога ў камуну. Мая азёрная краіна. (У кнізе: М. Машара «Урачыстасць» —Дзяржвыдавецтва БССР, 1952 г.).

Макаль П. Размова з дзяржавай. (У часопісе «Маладосць» № 10, 1957 г.). Кастрычніцкі вецер. (У часопісе «Маладосць», № 11, 1957 г.). У вагоне. (У часопісе «Маладосць» № 5, 1956 г.). Далягляд. (У часопісе «Беларусь» № 12, 1957 г.)

Марціновіч А. Роздум (У часопісе «Маладосць» № 1, 1958 г.)

Маеўскі В. Баран, байка. (У часопісе «Маладосць» № 4, 1956 г.)

Няхай Р. Есць такая партыя. Помнік Леніну. Думы партыі — думы народа. Слаўнае пакаленне. Баявым сябрам. (У кнізе: Р. Няхай «Вялікі мой і ціхі акіян» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1954 г.)

Нядзвецкі У. Веснавыя барозны. Паэма, урыўкі VI, IX (У часопісе «Маладосць» № 11, 1957 г.).

Панчанка П. Упэўненасць. Бульба. Наша слава. Помнік. Камсамольская вуліца. Сцягі перамогі. На будоўлі. (У кнізе: П. Панчанка «Вершы і паэмы» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1952 г.) Маім гераіням. Візітныя картачкі. Вынаходца. Здарэнне ў гасцях. (У часопісе «Полымя» № 3, 1956 г.) Патрыятычная песня, паэма, урывак на выбар. (У часопісе «Полымя № 11, 1957 г.)

ХАРАВЫЯ ТВОРЫ

Лукас Д. «Узнялося сонца яснае», сл. А. Русака. Для хору з ф-на. (Зб. «Здравствуй, молодость» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.). «Апошні вечар», сл. Э. Агняцвет. Для хору з ф-на. (Часопіс «Работніца і сялянка» № 3, 1957 г.) «Пасеялі дзяўчаты лён», сл. А. Астрэйкі. Для хору з ф-на. (Газета «Літаратура і мастацтва» ад 2 верасня 1956 г.)

Любан І. «Песня пра лепшых сяброў», сл. Л. Ашаніна. Для двухгалоснага хору з ф-на. (Музвыдавецтва, 1948 г.). «Ой, пайду я, выйду», сл. А. Русака, для хору. (Часопіс «Беларусь» № 1, 1956 г., або зб. «Песні» І. Любана —Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.).

Ляшэнка Л. «Лён», сл. Я. Купалы. (Зб. «Песні самадзейных кампазітараў Гродзеншчыны»—Дзяржвыдавецтва БССР, 1953 г.)

Наско М. «Жыве між нас Ленін», сл. Я. Коласа (Часопіс «Работніца і сялянка» № 1, 1954 г.)

Пукст Р. «Мір пемарожа вайну», сл. А. Бачылы. Для змешанага хору з ф-на. (Зб. «За мір» — «Дзяржвыдавецтва БССР, 1956 г.). «Мы усе — браты», сл. А. Вольскага, «Фестываль — Масква» (Зб. «Песні» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.). «Мінску — слава», сл. М. Гамолкі. Для змешанага хору без суправаджэння. (Часопіс «Работніца і сялянка» № 8, 1952 г.). «Ішоў казёл па мяжы». Для змешанага хору з ф-на. «Гляну, гляну я ў аконца» (з оперы «Машэка»). «На чаўне», сл. Э. Агняцвет. Для жаночага хору з ф-на. (Зб. «Хоры» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1951 г.), «Сонца», сл. А. Русака. Для хору ці дуэту. (Дзяржвыдавецтва БССР, 1954 г.) «Ураджайныя частушкі», сл. З. Бірала. (Дзяржвыдавецтва БССР, 1955 г.) «Партызанскія акопы», сл. М. Танка. Для змешанага хору без суправаджэння. (Зб. «Хоры беларускіх кампазітараў» — Музвыдавецтва, 1954 г.). «Павей, ветрык, павей». «Там на раллі». (Зб «Беларускія народныя песні» для змешанага хору без суправаджэння—Дзяржвыдавецтва БССР, 1956 г.). «Лугам зеляненькім», сл. З. Бядулі. Для хору з ф-на. («Насустрач фестывалю моладзі»—Дзяржвыдавецтва БССР, 1957 г.). «Лён». Беларуская народная песня. Апрацоўка Р. Пукста. (Зб. песень беларускіх кампазітараў—Дзяржвыдавецтва БССР, 1950 г.).

Падкавыраў П. «Ой, ляцелі гусі з броду». Для змешанага хору. «Паляцелі гусанькі цераз сад». Для жаночага хору. «Кацілася чорна галка». Для змешанага хору. «Спі, жонка, спі». Для змешанага хору. (Зб. «Беларускія народныя песні», а капела—Дзяржвыдавецтва БССР, 1948 г.). «Дайце з горачкі скаціцца». Апрацоўка П. Падкавырава. Для змешанага хору без суправаджэння. (Дзяржвыдавецтва БССР, 1950 г.). «Заручыны», сл. М. Танка. Для двух салістак і жаночага хору (Дзяржвыдавецтва БССР, 1955 г.). «На мяне не заглядайся», сл. А. Русака. Для голасу і жаночага хору з ф-на. «Песня пра лён», сл. А. Русака. Для хору з ф-на. (Зб. А. Русака «Песні» — Дзяржвыдавецтва БССР, 1954 г.).

На экранах у ліпені

У гэтым месяцы кінагледачы Беларусі ўбачаць на экранах дваццаць новых мастацкіх фільмаў. Сярод іх каляровая карціна «Праўда», знятая Кіеўскай кінастудыяй па аднаменнай п'есе А. Карнейчука, расказвае аб бурных рэвалюцыйных падзеях на ўкраінскай зямлі, кінафільм «Ідыёт», зроблены па раману Ф. М. Дастаеўскага ў пастаноўцы І. Пыр'ева; кінакамедыі «Наш мілы доктар», «Шафёр па няволі», фільмы «Вуліца маладосці» — пра маладых будаўнікоў-камсамольцаў, другая серыя «Івана Грознага», якая з'яўляецца апошняй работай выдатнага савецкага рэжысёра С. Эйзенштэйна, а таксама фільмы «Пад спякотным небам» (вытворчасць Бакінскай кінастудыі), «Апошні з Сабудара», кінафельетон «Жаніх з таго свету» (вытворчасці «Масфільм»), шырокаэкранны фільм «У гарах Саянскіх» і інш.

З твораў зарубежнай кінематаграфіі будуць паказаны кітайскі фільм «Баскетбалістка № 5», чэхаславацкая кінааповесць «Непераможаныя», заходнегерманская карціна «Перад захадам сонца», французская—«Разбітыя мары», венгерская—«Сын двух мацярэй» і іншыя.

Апроч названых мастацкіх фільмаў нашы гледачы ўбачаць некалькі хранікальна-папулярных і лялечных карцін.

Д. ДРАНКЕВІЧ.

Чэхаславацкія сустрэчы

Гэта была незвычайная паездка. Усе мы, людзі розных прафесій і ўзростаў, ехалі да чэхаславацкага народа. І ён прыняў нас, як прымаў і прымае ўсіх пасланцоў нашай краіны. Мне не хочацца ўпадаць у патэтыку, але ўвесь наш шлях—Готвальдаў, Прага, Карлавы Вары, Брно, Браціслава, Татранска Ломніца—быў не толькі шляхам па дарогах Чэхаславакіі; гэта быў шлях ад сэрца да сэрца.

Колькі сустрэч, сяброўскіх поціскаў рук, абменаў адрасамі, гутарак і спрэчак! Мы наведалі заводы, мы гасцілі ў сялян, мы аглядвалі старажытныя саборы і замкі. Запомніліся сустрэчы з пісьменнікамі—іх было многа. І першай была сустрэча з Т. Сваталукам.

ГОРАД Готвальдаў—горад малады. Прамыя кубы будынкаў—высокіх, светлых, чыстых. Вакол дамоў—сады. У цэнтры горада славуты камбінат «Світ»—народнае прадпрыемства, цэнтр абутковай прамысловасці краіны. Раней гэты горад (ён называўся Злін), быў цэнтрам магутнага канцэрна фабрыканта Баці—караля чаравікаў, гершага басаножак, імператара шлёпанцаў. Баця паступова прыбраў да рук і паліцыю, і прэсу, і нават урад. Ён быў вельмі хітрым эксплуататарам. Ні адна хвіліна на яго прадпрыемстве не прападала дарма. Ён умеў выціскаць з рабочых усё, прычым рабіў гэта з ласкавым выглядам дабрадзея і клапатлівага гаспадара...

Усё гэта расказаў нам пісьменнік, Т. Сваталук, які жыве ў Готвальдаве. Ён прыйшоў да нас у гасцініцу «Масква», немалады, хударлявы і сутулы чалавек. Мы доўга гаварылі аб горадзе Готвальдаве, разам хадзілі аглядаць цэхі завода «Світ».

Сёе-тое пісьменнік расказаў пра свае кнігі і сябе. Яго першай буйнай кнігай быў раман «Батастрой». Аўтар мала вядомых да таго часу апавяданняў, сціплы мастак-плакатыст раптам выдаў кнігу, у якой бязлітасна выкрывалася не толькі катаржная праца, якая знясільвала, стамляла, зводзіла чалавека да ўзроўню дэталі вялікай машыны, але і філасофія капіталіста, які прыкідваўся дабрадзеем чалавецтва.

У цэнтры кнігі быў вобраз нейкага Шэфа. Ці варта гаварыць, што ўся краіна адразу пазнала, хто быў прататыпам Шэфа. Хто ж яшчэ мог сказаць так: «Трэба сцябаць людзей, навязваць ім сваю волю, прыгнятаць іх асобу... Плюю на душу, на мараль, на сэрца».

Баця пачаў працэс супраць пісьменніка. Сваталук расказвае цяпер аб гэтым са спакоем гісторыка. Не думаецца, што калі супраць яго апалчыліся купленыя Бацей газеты і адвакаты, калі нават кнігавыдавецтва, якое выдала «Батастрой», стала перад пагрозай астракізма, ён быў таксама спакойны. Але як бы там ні было, у сваёй наступнай кнізе Сваталук якраз напісаў аб гэтай барацьбе. Называлася яна «Трэст Гардон падае ў суд», а расказвалася ў ёй усё пра таго ж Бацю і яго паслугачоў!

Сваталук гаворыць нам аб тым, што апошнія нашчадкі Баці верай і праўдай служылі Гітлеру, а ў бязглуздую галаву аднаго з іх прыйшла думка—ні больш, ні менш, як аб перасяленні ўсяго чэшскага народа ў Паўднёвую Амерыку, з паслужлівай аддачай усіх зямель нямецкім фашыстам.

Мы распытваем Сваталука аб яго новай вялікай кнізе, якая як бы працягвае «Батастрой», але ўжо расказвае аб новай Чэхаславакіі, кнізе «Без шэфа».

Размова паступова захоплівае ўсіх. Гутарым аб сустрэчах з Фучыкам, аб перакладах чэшскіх кніг. Потым пісьменнік гаворыць аб сваёй новай п'есе «Нясмелымі крокамі», прысвечанай падзеям ужо зусім нядаўнім—ломцы псіхалогіі тых людзей, хто яшчэ не здолеў развітацца з перажыткамі капіталізма ў свядомасці, аб барацьбе за новага чалавека. Гэта п'еса ідзе ў тэатры Готвальдава...

Потым мы бачылі герояў Сваталука на вуліцах індустрыяльнага Готвальдава. Яны ішлі працаваць у чыстыя механізаваныя цэхі свайго народнага, а не бацеўскага завода.

Вясёлыя, ажыўленыя твары, простае, прыгожае адзенне. Вось яны, героі рамана «Без шэфа», сапраўдныя будаўнікі і гаспадары завода, горада, жыцця!

СТАВЕЖАВЫ горад Прага на выгібе Влтавы ведае многа легенд і паданняў. Мы ідзем у Градчаны туды, дзе развяваецца сцяг прэзідэнта, дзе на працягу стагоддзяў білася і б'ецца сэрца слаўнай краіны. Мы ідзем у сабор святога Віта, які будаваўся на працягу некалькіх стагоддзяў, пачынаючы з XIII. Мы глядзім на мармуровыя саркафагі, цяжкія пліты якіх сталі старонкамі кнігі гісторыі. Мы крочым па залах манастыра Ларэты, дзе захоўваецца нечуваная скарбніца... Не, не закрылі самыя цудоўныя брыльянты яе тое, што засталося для нас самым дарагім—рабочы почырк народа—народа-муляра, народа-разбяра, народа-скульптара.

Але не пышнасцю сярэдневякоўя канчаецца для нас гісторыя гэтай краіны. Мы, хто захапляўся замкам Карлштэйн, не забылі трагедыю Лідыцэ—маленькай вёсачкі, начыста знішчанай фашыстамі. Мы, хто любаваўся сярэдневяковымі фаліянтамі ў музеі помнікаў літаратуры,—тут захоўваюцца найстаражытнейшыя пергаменты—не забыліся пра маленькую кнігу Юліуса Фучыка—«Рэпартаж з пятлёй на шыі». Мы, хто затаіўшы дыханне, глядзелі на магутны ансамбль сярэдневяковых Градчан, з пяшчотай, павагай і любоўю ішлі па пакоях дома, дзе збіралася Пражская канферэнцыя, дома, дзе гучаў голас Леніна.

Мы жылі ў Празе ў гасцініцы «Дружба». Адначасова з намі тут жылі негры, егіпцяне, кітайцы і прадстаўнікі яшчэ вельмі многіх народаў.

Мы хадзілі па вуліцах Прагі, мірнай Прагі і спрачаліся аб стылях архітэктуры. Мы разглядалі плакаты, якія заклікалі да лагалоўнай барацьбы з п'янствам, але не бачылі ніводнага п'янага. Мы ездзілі ў маленькіх трамваях і думалі аб будучым пражскім метро.

Карацей кажучы, вельмі хутка мы адчулі сябе ў гэтым горадзе сваімі. Ды і як было не адчуць. Кожны сустрэчны, пачуўшы рускую мову, гатоў быў стаць не толькі нашым праваднікам, але і гасцінным гаспадаром.

Ставежавая Прага, злата Прага! Ты засталася ў нашай памяці, як горад адвечнай мудрасці, горад радасці, горад дружбы.

ЯН ДРДА нам палюбіўся з першага погляду. Дужы здаравяка, весяльчак, гучнагалосы прамоўца, ён з першай жа гаворкі аб літаратурнай Празе, накінуўся на нямецкіх рамантыкаў.

— Гэта яны зрабілі наш горад нейкім змрочным і хмурым. Усе гэтыя бясконцыя легенды аб старажытных могілках, аб скарбах сярэдневяковых сабораў, аб старадаўнім гета—усё гэта проста набор жахаў!

Ён, відаць, не хацеў, каб старая Прага закрыла для нас, прыезджых, новую.

Ян Дрда выдатны знаўца гісторыі, старога фальклору, аўтар зборніка старых казак, і да таго ж п'есы «Гульня з чортам», якая ідзе ў Маскве ў тэатры лялек пад назвай «Чортаў млын».

Разгаварыліся пра народнае мастацтва. Ян Дрда не мог не паказаць нам магазіны вырабаў народнага мастацтва, кожны з якіх быў адначасова і своеасаблівай выстаўкай. І ў нашых руках адзін за другім паяўляліся прыгожыя нацыянальныя збаночкі з чэшскім арнаментам, фарфоравыя птушкі, звяры і розныя іншыя прадметы народнага рамяства...

Вечарам гэтага дня наша размова працягвалася. Мы ўбачылі развешаныя на сценах акварэлі і малюнкі Іозефа Лады, які так умела ілюстраваў творы Я. Гашэка, цудоўныя рэпрадукцыі Ван-Гога і Гогена і вялікі збор народных вырабаў з фарфору. Размова зноў пайшла пра выяўленчае мастацтва. Мой стары знаёмы—паэт Яраслаў Войцех, флегматычны стары, які лічыць сябе ленінградцам (ён вучыўся ў Ленінградскім універсітэце) і драматург Павел Когаут—аўтар добра сустрэтай у нас п'есы «Такая любоў» уцягнуліся ў нашу размову аб народнай архітэктуры і народным арнаменце, аб сучасным мастацтве графікі...

Але апрача пытанняў мастацтва, то ў падтэксце нашай гутаркі, то ў прамой гутарцы ішла размова аб іншых пытаннях—аб брацтве нашых народаў, аб дружбе. Нас прымусілі расказаць пра блакаду Ленінграда. Нашы субяседнікі загаварылі аб паўстанні ў акупіраванай Празе. Я ўспомніў нашумелую ў нас кнігу Яна Дрды «Нямая барыкада». Гэта кніга прыйшла да нас адначасова з кнігай Юліуса Фучыка «Рэпартаж з пятлёй на шыі». Яна дапамагла нам зразумець многае ў характары чэшскага народа. Гутарка ішла ў ёй аб героях барацьбы супраць фашызма... Героі пісьменніка—простыя людзі, якія ўсімі сіламі сваёй душы ненавідзелі акупантаў.

ЧАЛАВЕК, які сядзеў за клавіятурай органа ў Доме мастацтва ў Готвальдаве, паклаў рукі на клавішы... І адразу прыйшла песня. Не, вядома, не гэтую мелодыю, народжаную ў вялікай канцэртнай зале горада Готвальдава, слухалі мы, праязджаючы па цяснінах і далінах Славакіі. Не яна ляцела нам насустрач з тунеляў, не яна грукатала над жалезнымі мастамі і кацілася насустрач нам у снежных Татрах, у цёплай квітнеючай Браціславе, у заціснутых з двух бакоў гарамі Карлавых Варах.

Але здаецца, што чэшская песня пачалася для нас з гэтага маленькага імправізаванага арганнага канцэрта, Вядома, некаторыя з нас і раней чулі і лютню, і чэшскі слаўнік, і іншыя народныя інструменты. Гэта ж яшчэ ў трынаццатым стагоддзі ў гэтай краіне ўжо быў напісаны «Трактат аб музыцы» праслаўленага Іераніма Мараўскага!

Песні сялян-паўстанцаў, баявыя гімны гусітаў, папеўкі вандроўных студэнтаў—з кожнай старонкі гісторыі гэтай краіны даносіліся да нас песні і гімны. Хто з народных барацьбітоў за вызваленне не ўвайшоў у песню, не застаўся яе героем? Як і ў нас, песня заставалася з народам Яна ішла за ім у радасцях і няшчасцях.

Але гутарка ідзе не толькі аб мінулым. Песня баявая, грозная, савецкая ўвайшла ў Прагу з першым савецкім танкам-вызваліцелем, сталёвым гігантам, які стаў навечна помнікам чэшскага вызвалення. І цяпер дзе б ні паяўляліся мы, па якіх бы дарогах ні ехалі, песня ішла з намі, двухмоўная песня нашай радасці і вясны.

У Чэхаславакіі любяць песню, любяць спяваць. Неяк у нашу гасцініцу ўвайшлі некалькі дзяўчат і сказалі, што яны ўдзельніцы самадзейнасці і хочуць, згодна традыцыі, праспяваць нам свае песні. Затаіўшы дыханне, слухалі мы мову зразумелую ўсім народам на зямлі—мову песні.

Песня ішла за намі. Яна даганяла нас на вуліцы. Яна ўваходзіла ў нашы пакоі праз расчыненыя вокны. Яна вяла нас за сабой.

Перад нашым ад'ездам з Прагі ў наш аўтобус увайшоў сур'ёзны паважны чалавек сярэдніх год—адзін з кіраўнікоў турысцкага таварыства. Ён сказаў нам некалькі слоў прывітання, а потым, спыніўшы сам сябе, раптам заспяваў.

Ён спяваў вясёлую застольную песню. І калі наша здзіўленне развеялася—шчыра гаворачы, мы чакалі доўгую прамову—пачалі яму падцягваць.

Відаць, у Празе нельга знайсці чалавека, які не ведаў бы імён Дворжака, Сметаны, Яначэка, Новака і інш. Кожны адвядзе вас у музеі Сметаны, Дворжака, Моцарта. І ўжо, напэўна, ва ўсёй Чэхаславакіі не знайсці чалавека, які не быў бы так ці інакш звязаны—хоць бы як радыёслухач—са штогадовым музычным фестывалем—«Пражскай вясной».

Тут любяць музыку, любяць танцы і песні!

МЫ сустракаліся з многімі пісьменнікамі—і чэхамі і славакамі. Было б проста немагчыма расказаць аб усіх сустрэчах...

Дзе вы, нашы сябры — празаік, драматург, рэдактар часопіса Мілан Ярош, партызан і празаік Мілаш Крно?

Памятаю, як у Браціславе мы гаварылі аб Ільфе і Пятрове з Янам Ферэнчыкам—ён пераклаў «Дванаццаць крэслаў», заканчвае цяпер «Залатое цялё» (і збіраецца перакладаць кнігу ленінграда Леаніда Салаўёва аб Насрэдзіне). З Верай Мігалікавай мы гутарылі аб яе аповесці, прысвечанай славацкім паўстанцам і аб перакладах рускіх, украінскіх і беларускіх паэтаў. Вера Довінава расказала аб найбольш папулярных кнігах славацкіх пісьменнікаў, а Рудольф Скукалік чытаў мне свае пераклады Маякоўскага на славацкую мову.

Мы ішлі па загараднаму парку, дзе знаходзіцца Дом творчасці славацкіх пісьменнікаў, і добра адчувалі сябе сярод самых блізкіх сяброў...

Між іншым, гэта пачуццё не пакідала нас у час усёй паездкі. У кніжных магазінах я бачыў вельмі многія кнігі нашых пісьменнікаў.

Настаўнік Яраслаў Сладкі гаварыў з намі пра Мікалая Астроўскага. Выкладчык настаўніцкага інстытута Карэл Цыгна, з якім мы гулялі па набяржнай ракі Цеплай у Карлавых Варах і, між іншым, ведаў яшчэ Яраслава Гашэка, з вялікай цеплынёй гаварыў аб шматнацыянальнай савецкай літаратуры і аб яе ўплыве на чэшскую літаратуру...

Іншы раз размова аб нашай агульнай рабоце перапынялася ўспамінамі. І тады, вельмі часта аднекуль з запаветнай шуфляды выцягвалася фатаграфія з датай «1945» і мы маглі чытаць: «гор. Банске Быстрыца. Ад капітана Малеева Н. Т. на памяць. Няхай мой вобраз напомніць вам мае перажыванні і радасці». Я бачыў многа такіх фатаграфій. На іх былі непадобныя адзін да другога людзі ў форме савецкіх афіцэраў і салдат і былі розныя надпісы, зробленыя рознымі почыркамі, з самымі неверагоднымі росчыркамі прозвішчаў. Але ва ўсім гэтым было нешта агульнае—пачуццё любві, якое звязвае чалавека, знятага на фота, і таго, хто захаваў гэтую памяць на многія гады.

Мы ехалі па дарогах Чэхаславакіі. Гэта быў шлях ад сэрца да сэрца.

Дзм. МАЛДАЎСКІ.

Выпраўленне памылкі

У мінулым нумары нашай газеты ад 2 ліпеня ў заметцы «Сустрэча з кампазітарам» (першая старонка) па віне работніка рэдакцыі дапушчана памылка. У тэксце і ў подпісе замест **Чэрыкаўскага** раённага Дома культуры трэба чытаць **Чачэрскага.**

Галоўны рэдактар Мікола ТКАЧОЎ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у сераду і суботу.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-21-53, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэр